СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

27 снежня 2010 года, № 21 (2037)

# ЗАПРАШАЕ БДУ!

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** – найстарэйшы класічны ўніверсітэт нашай краіны, вядучая вышэйшая навучальная ўстанова ў сістэме нацыянальнай адукацыі, найбуйнейшы адукацыйны, навукова-вытворчы і культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь.

Зараз у БДУ навучаецца 28,96 тыс. студэнтаў, з іх 20,2 тыс. – на дзённай і 8,76 тыс. – на завочнай форме навучання. Іх падрыхтоўкай займаюцца больш за 2,9 тыс. выкладчыкаў, у тым ліку 15 акадэмікаў і 16 членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, больш за 400 прафесараў і больш за 1600 кандыдатаў навук. Навучальны працэс вядзецца па 55 спецыяльнасцях, 68 напрамках, па 258 спецыялізацыях.

**У 2011 годзе** прыём на першы курс будуць ажыццяўляць 16 факультэтаў, а таксама Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій, Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы. Усяго плануецца прыняць больш за 5,5 тыс. абітурыентаў, у тым ліку каля 2 тыс. на дзённую бюджэтную форму навучання.

Упершыню будзе ажыццяўляцца прыём на напрамкі: фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій (фізічны факультэт), касмааэракартаграфія (геаграфічны факультэт), дзелавая камунікацыя, руская мова як замежная (філалагічны факультэт), на спецыяльнасць «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» (Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій). Плануецца адкрыццё спецыяльнасцяў «Мікрабіялогія», «Біяхімія» (біялагічны факультэт).

Студэнты, паспяховасць якіх не ніжэйшая за «сем», пасля заканчэння другога курса могуць на платнай аснове паралельна навучацца па другой спецыяльнасці і ў выніку атрымаць два дыпломы.

Упершыню для набыцця другой вышэйшай адукацыі па скарочаным тэрміне будзе ажыццяўляцца набор па спецыяльнасцях: «Прыкладная інфарматыка (напрамак – праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)» (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі), «Мытная лагістыка» (факультэт міжнародных адносін).

Ва ўніверсітэце пастаянна вядзецца пошук новых метадаў і тэхналогій выкладання і арганізацыі навучальнага працэсу, якія скіраваны на стварэнне ўмоў для самастойнага набыцця ведаў пры кансультацыях і пад кантролем кваліфікаваных выкладчыкаў. Арганізацыя навучальнага працэсу ў БДУ грунтуецца на абавязковым спалучэнні яго з навукова-даследчай дзейнасцю. Нашы выпускнікі сёння працуюць па ўсёй краіне і далёка за яе межамі, і ўсюды яны пацвярджаюць высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі.



*Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей Уладзіміравіч АБЛАМЕЙКА*

Асаблівая ўвага ва ўніверсітэце надаецца ўмацаванню каапераці ў галіне адукацыі і навукі з іншымі айчыннымі і замежнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. БДУ мае пагадненні аб супрацоўніцтве больш чым са 100 універсітэтамі з 44 краін свету.

У БДУ створаны спрыяльныя ўмовы для працы і адпачынку. Каля 75% іншагародніх першакурснікаў атрымліваюць месца ў інтэрнаце. На працягу 2011 г. будзе ўведзены ў эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту яшчэ адзін інтэрнат на больш як 1100 месцаў. Да паслуг студэнтаў – стадыёны, спартыўныя і трэнажорныя залы, басейны. Дзейнічае больш за 60 агульнаўніверсітэцкіх творчых калектываў і аб'яднанняў.

Дарагія абітурыенты! Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт зацікаўлены, каб у яго аўдыторыі прыйшлі самыя падрыхтаваныя і таленавітыя маладыя людзі. Незалежна ад абранай спецыяльнасці навучання ў вас ёсць магчымасць атрымаць тут адукацыю сусветнага ўзроўню.

**Жадаем поспехаў!**

## АДРАС ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ

***г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, корпус геаграфічнага факультэта. Даведкі па тэл. 209-50-85 (шматканальны). Уся інфармацыя, што датычыцца паступлення ў БДУ, размешчана на сайце: www.bsu.by***

## ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ДЗЁН АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ У 2010/2011 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

| № | Факультэт | Дата і час | Адказныя, кантактныя тэлефоны |
|---|---|---|---|
| 1. | БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Курчатава, 10, аўд. 1) | 30 снежня 2010 г., 13-30<br>31 сакавіка 2011 г., 13-30 | Дзітчанка Таццяна Іванаўна 209-59-00 |
| 2. | ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Кастрычніцкая, 2, канферэнц-зала) | 26 лютага 2011 г., 10-00 | Хобта Віталь Міхайлавіч 209-52-83 |
| 3. | ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Ленінградская, 16, аўд. 116) | 5 студзеня 2011 г., 12-00<br>30 сакавіка 2011 г., 12-00 | Кавальчык Надзея Уладзіміраўна 209-54-87, 209-54-79 |
| 4. | ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Чырвонаармейская, 6, актавая зала) | 6 студзеня 2011 г., 12-00<br>2 красавіка 2011 г., 12-00 | Бярэйшык Лілія Уладзіміраўна 209-55-98 |
| 5. | ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Курчатава, 5, аўд. 212) | 3 студзеня 2011 г., 12-00<br>28 сакавіка 2011 г., 12-00 | Янушэвіч Іван Іванавіч 209-59-20 |
| 6. | МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (пр. Незалежнасці, 4, аўд. 433) | 5 студзеня 2011 г., 14-00<br>30 сакавіка 2011 г., 14-00 | Мядзведзеў Дзмітрый Георгіевіч 209-52-49 |
| 7. | ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ ІНСТЫТУТА ЖУРНАЛІСТЫКІ (вул. Кальварыйская, 9, акт. зала) | 4 студзеня 2011 г., 12-00<br>29 сакавіка 2011 г., 12-00 | Зубчонак Наталля Анатольеўна 259-70-32 |
| 8. | ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН (вул. Акадэмічная, 25, аўд. 603) | 5 студзеня 2011 г., 16-00<br>31 сакавіка 2011 г., 16-00 | Рашэтнікаў Дзмітрый Георгіевіч 284-08-67 |
| 9. | ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ (пр. Незалежнасці, 4, аўд. 521) | 5 студзеня 2011 г., 14-00<br>2 красавіка 2011 г., 14-00 | Задворны Барыс Валянцінавіч 209-50-70 |
| 10. | ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ (вул. Курчатава, 5, аўд. 115) | 6 студзеня 2011 г., 10-00<br>9 красавіка 2011 г., 10-00 | Садаў Васіль Сяргеевіч 209-58-36 |
| 11. | ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК (вул. Кальварыйская. 9, аўд. 635) | 4 студзеня 2011 г., 14-00<br>30 сакавіка 2011 г., 14-00 | Бобр Аляксандр Міхайлавіч 259-74-06 |
| 12. | ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (пр. Незалежнасці, 2, аўд. 220) | 5 студзеня 2011 г., 12-00<br>26 сакавіка 2011 г., 11-45 | Саладухін Ігар Анатольевіч 209-50-67 |
| 13. | ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. К. Маркса, 31, актавая зала) | 4 студзеня 2011 г., 12-00<br>1 красавіка 2011 г., 12-00 | Важнік Сяргей Аляксандравіч 222-36-02 |
| 14. | ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Ленінградская, 14, аўд. 201) | 5 студзеня 2011 г., 10-00<br>30 сакавіка 2011 г., 10-00 | Якіменка Таццяна Мар'янаўна 209-51-74 |
| 15. | ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. К. Маркса, 31, аўд. 63) | 6 студзеня 2011 г., 14-00<br>2 красавіка 2011 г., 14-00 | Вараб'ёў Аляксандр Уладзіміравіч 226-39-96 |
| 16. | ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ (вул. Ленінградская, 8, аўд. 609) | 4 студзеня 2011 г., 10-00<br>30 сакавіка 2011 г., 10-00 | Сатолін Уладзімір Мікалаевіч 209-52-79 |
| 17. | ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ (вул. Шпалерная, 7, аўд. 106) | 5 студзеня 2011 г., 11-00<br>30 сакавіка 2011 г., 11-00 | Барабан Валянціна Іосіфаўна 306-00-19 |
| 18. | ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ (вул. Рэвалюцыйная, 11, аўд. 309) | 5 студзеня 2011 г., 12-00<br>31 сакавіка 2011 г., 12-00 | Кавалінскі Анатоль Іванавіч 210-41-06 |
| 19. | ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ (пр. Незалежнасці, 24, аўд. 307) | 4 студзеня 2011 г., 16-00<br>29 сакавіка 2011 г., 16-00 | Шымбалёва Алена Юр'еўна 227-64-65 |
| 20. | ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ (вул. Камсамольская, 21, аўд. 409) | 5 студзеня 2011 г., 10-00<br>30 сакавіка 2011 г., 10-00 | Урублеўская Ніна Генадзьеўна 209-43-68 |
| 21. | ЛІЦЭЙ (вул. Ульянаўская, 8, актавая зала) | 4 студзеня 2011 г., 11-00<br>29 сакавіка 2011 г., 11-00 | Андрэева Алена Паўлаўна 209-56-01 |
| 22. | ФАКУЛЬТЭТ ДАЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ (вул. Маскоўская, 15, актавая зала) | 5 студзеня 2011 г., 14-00<br>30 сакавіка 2011 г., 14-00 | Сакольчык Ірына Анатольеўна 200-79-64 |

## Паважаныя абітурыенты!

Рэдакцыя газеты «Універсітэт» сумесна з прыёмнай камісіяй БДУ рыхтуе да друку яшчэ адзін **спецвыпуск для абітурыентаў**, дзе плануецца размясціць парадак і план прыёму ў БДУ, праграмы ўступных іспытаў, прыкладныя варыянты экзаменацыйных заданняў, графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання і іншую інфармацыю.

**Спецыяльныя выпускі газеты «Універсітэт» для абітурыентаў** можна набыць у кніжных кіёсках «Універсітэцкая кніга», размешчаных у фае галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4) і корпусе юрыдычнага факультэта (вул. Ленінградская, 8).

# ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**_Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК_**
**_Адрас: Мінск, прасп. Незалежнасці, 2. Тэл. 209-52-67; 209-51-15._**
**_E-mail: physdean@bsu.by; www.physics.bsu.by_**

Агульная колькасць прафесараў – 31; дацэнтаў – 68; аспірантаў – 47; магістрантаў – 18; студэнтаў – 724.

Падрыхтоўка ажыццяўляецца па спецыяльнасці **«Фізіка»**, у межах якой пяць напрамкаў: навукова-даследчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Даследчык»*), вытворчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), ядзерныя фізіка і тэхналогіі (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), кіраўніцкі (кваліфікацыя – *«Фізік. Менеджар»*) і навукова-педагагічны (кваліфікацыя *«Фізік. Выкладчык фізікі і інфарматыкі»*). У 2011 г. плануецца пачаць падрыхтоўку па напрамку фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогіі (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*).

На другім курсе студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях, якія адпавядаюць розным галінам сучаснай фізічнай навукі: нана- і мікраэлектроніка, фізіка паўправаднікоў і паўправадніковых матэрыялаў, праграмаванне і інфармацыйнае забеспячэнне вылічальных сістэм, біяфізіка і біятэхналогіі, квантавая і аптычная электроніка, лазерныя сістэмы і тэхналогіі, фізічная оптыка, ахоўныя і плазменныя пакрыцці і плёнкі, фізіка цвёрдага цела і матэрыялазнаўства, ядзерная фізіка, фізіка ядзерных рэактараў і атамных энергетычных установак, ядзерная бяспека, электроннае прыборабудаванне і схематэхніка, энергафізіка і нетрадыцыйныя крыніцы энергіі, атамная фізіка і фізічныя метады пераўтварэння інфармацыі, тэарэтычная фізіка і іншыя.

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы і матэматыцы, асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі і інфарматыку. Штогод частка нашых выпускнікоў размяркоўваецца па заяўках вядучых камп'ютарных кампаній: СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» (больш вядомае як IBA), ЗП «ЭПАМ Сістэмз», ЗАТ «Ітранзішн» і інш.



Нашы выпускнікі працуюць у НДІ, канструктарскіх бюро, навукова-вытворчых прадпрыемствах, навучальных установах і іншых арганізацыях, у тым ліку ў разнастайных фірмах.

Як выбраць верную дарогу ў жыцці? Як не памыліцца? Думкамі з гэтай нагоды з намі падзялілася студэнтка магістратуры кафедры біяфізікі ***Алена Голубева,*** якая скончыла фізфак у 2010 г.: *«Яшчэ шэсць гадоў таму для мяне гэта было вельмі складанае пытанне, – кажа Алена. – Калі выбіраеш у якасці свайго шляху фізіку, цяжка адразу ўявіць сабе, што будзеш рабіць потым з гэтымі складанымі, вельмі абстрактнымі, як здаецца спачатку, ведамі. Але гэта толькі спачатку. Потым атрымліваецца, што без фізікі ты – гэта ўжо зусім не ты. Пачынаеш гэта разумець тады, калі атрымліваеш першыя вынікі, выступаеш на першай канферэнцыі, друкуеш першы артыкул, хай для пачатку ўсяго толькі ў зборніку матэрыялаў канферэнцыі. Так пачынаецца дарослае «фізічнае» жыццё. Тваёй працай пачынаюць цікавіцца, паступаюць прапановы ад іншых арганізацый – і тое, што атрымаў ты сваім розумам, пачынае знаходзіць сваё прымяненне недзе яшчэ: на вытворчасці, у медыцыне, у галіне інфармацыйных тэхналогій і г.д. А калі ты бачыш, што твая праца запатрабавана, не ці гэта лепшы доказ таго, што шэсць гадоў таму быў зроблены правільны выбар?»*

Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца да працы не толькі па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і інш.). Доказвае гэта прыклад ***Віталя Брагінца,*** выпускніка фізічнага факультэта, а зараз дырэктара уласнай юрыдычнай фірмы, якая паспяхова існуе ўжо 10 гадоў. *«Вельмі добра адчуваецца розніца паміж падыходам да права юрыста і падыходам фізіка-юрыста, – падзяліўся ўласным досведам Віталь Фёдаравіч. – Разглядаючы заканадаўства, я аналізую яго так, як гэта робяць фізікі ў дачыненні да фізічных заканамернасцяў і з'яў. Тым больш, сённяшнее жыццё немагчыма ўявіць без высокіх тэхналогій. А займацца юрыдычным суправаджэннем навукова-тэхнічных галін, безумоўна, можа толькі той, хто добра знаёмы з імі».* В. Брагінец лічыць, што фізічны факультэт – выдатнае месца для набыцця ведаў і навыкаў, якія могуць быць скарыстаныя ў прынцыпе ў любой прафесіі. Ён спрыяе развіццю аналітычнага мыслення, логікі – таго, што неабходна для паспяховай дзейнасці ў кожнай сферы.

Больш падрабязныя звесткі пра факультэт можна знайсці на нашым сайце, дзе змешчана інфармацыя пра работу вочна-завочнай школы па фізіцы і матэматыцы для абітурыентаў, а таксама шмат іншай карыснай інфармацыі.

Паважаныя абітурыенты! Мы сардэчна запрашаем вас на фізічны факультэт БДУ, дзе вы зможаце атрымаць якасную сучасную адукацыю і авалодаць самай універсальнай прафесіяй – ФІЗІК.

# МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

**_Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Дзмітрый Георгіевіч МЯДЗВЕДЗЕЎ_**
**_Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4._**
**_Тэл. 209-50-46, 209-52-49._**
**_E-mail: medvedev@bsu.by; www.mmf.bsu.by_**

На 11 кафедрах працуюць 152 выкладчыкі, з іх 5 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, 35 прафесараў, 83 дацэнты, кандыдаты навук.

Факультэт прапануе дзве спецыяльнасці – **«Механіка»** і **«Матэматыка»**.

У рамках спецыяльнасці **«Механіка»** вядзецца падрыхтоўка па розных напрамках сучаснай механікі і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у механіцы. Спецыялізацыі: «Фундаментальныя і прыкладныя праблемы механікі суцэльных асяроддзяў», «САПР і робататэхніка ў механіцы», «Камп'ютарная механіка», «Біямеханіка» і «Механіка нанасістэм».

Выпускнікі спецыяльнасці працуюць у ВНУ; навукова-даследчых установах; канструктарскіх і праектных арганізацыях; ва ўстановах і арганізацыях, звязаных з мадэляваннем (матэматычным і камп'ютарным) механічных працэсаў і механізмаў, а таксама з праграмаваннем. Кваліфікацыя *«Механік. Матэматык-прыкладнік»*.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці **«Матэматыка»** вядзецца на навукова-вытворчым і навукова-педагагічным аддзяленнях з вывучэннем найноўшых праграмна-інфармацыйных асяроддзяў, што дае магчымасць размеркавання ў прэстыжныя IT-кампаніі.

Выпускнікам навукова-вытворчага аддзялення даецца кваліфікацыя *«Матэматык»*. Яны працуюць у навучальных установах, навукова-даследчых інстытутах, канструктарскіх бюро, інфармацыйных цэнтрах, на прадпрыемствах, у банках і г. д.

Студэнты навукова-педагагічнага аддзялення дадаткова вывучаюць прадметы псіхолага-педагагічнага цыкла. Кваліфікацыя *«Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі»*.

Падрыхтоўка па спецыяльнасці «Матэматыка» адбываецца па індывідуальных навучальных планах, адпаведных сённяшнім патрабаванням.

Спецыялізацыя «Матэматычныя метады ў эканоміцы» мае эканамічны напрамак. Выпускнікі працуюць як прафесійныя матэматыкі ў даследчых установах, а таксама як эканамісты-матэматыкі – у банках, страхавых фірмах, агенцтвах па продажы нерухомай маёмасці і г. д. Кваліфікацыя *«Матэматык. Матэматык-эканаміст»*.

Спецыялізацыя «Матэматычная электроніка» адносіцца да навукова-канструктарскай дзейнасці. Выпускнікі працуюць у айчынных і замежных даследчых установах, праектных арганізацыях, на прадпрыемствах. Кваліфікацыя *«Матэматык. Канструктар праграмна-апаратных сістэм»*.



Выпускнікі спецыялізацыі «Камп'ютарная матэматыка» з'яўляюцца спецыялістамі па распрацоўцы, стварэнні і суправаджэнні інфармацыйных сістэм любога ўзроўню; распрацоўцы і прымяненні матэматычных метадаў апрацоўкі, назапашвання, надзейнасці захавання, перадачы і забеспячэння ахоўы інфармацыі. Кваліфікацыя *«Матэматык. Сістэмны аналітык»*.

На спецыялізацыі «Вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі» студэнты вывучаюць курсы па асноўных мовах праграмавання, Java- і NET-тэхналогіях, тэхналогіях праектавання і работы з базамі даных, камп'ютарнай бяспецы і ахове інфармацыі. Кваліфікацыя *«Матэматык. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях»*.



***Алег БАБУЛЬ,*** *інжынер-праграміст* ЗП «ЭПАМ Сістэмз». *Выпускнік 2006 г.*

*– Менавіта ў студэнцкія гады вызначаецца кола інтарэсаў маладога чалавека і закладваюцца прафесійныя навыкі, якія ён будзе развіваць і выкарыстоўваць у будучыні. Асноўны ўплыў на працэс фарміравання далягляду студэнтаў аказваюць выкладчыкі, якія раскрываюць перад імі розныя перспектывы і дапамагаюць рэалізаваць сябе.*

*На механіка-матэматычным факультэце выдатны прафесарска-выкладчыцкі калектыў. Цікавасць да праграмавання ў мяне з'явілася дзякуючы лекцыям І.М. Блінова і С.В. Суздаля. Працую інжынерам-праграмістам больш за 5 гадоў, зараз у кампаніі EPAM Systems – вядучага распрацоўшчыка праграмнага забеспячэння ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.*



***Віктар Лявонаў,*** *дырэктар аўтацэнтра «Атлант-М Уручча» ў Мінску. Выпускнік 2002 г.*

*– Вызначальным для мяне пры паступленні на механіка-матэматычны факультэт стала парада Чурбанава Юрыя Дзмітрыевіча, які выкладаў мне ў Ліцэі БДУ. Ён сказаў: «Віктар, на тваім месцы я б абавязкова паступаў на ММФ. Там цябе навучаць галоўнаму – працаваць галавой». Гэты выбар быў правільным. Я сапраўды навучыўся галоўнаму – думаць, вырашаць розныя праблемы, і галоўнае – у мяне ёсць упэўненасць, што невырашальных задач няма, ёсць тыя, рашэння якіх я пакуль не ведаю.*

*Я з цеплынёй узгадваю гады, праведзеныя ў ВНУ. Вучыцца было цікава, жыць – весела, пазнаваць новае – займальна. В.У. Курсаў, П.А. Корзан, Э.І. Звяровіч, М.В. Лазаковіч, В.У. Балашчанка, Д.Г. Мядзведзеў былі для мяне не проста выкладчыкамі – яны сталі маімі настаўнікамі па менеджменце, матывацыі, кіраванні групай.*

*У сваім жыцці я сустракаю вялікую колькасць паспяховых людзей, моцных кіраўнікоў, выдатных лідараў, прычым мяне асабліва радуе тое, што сярод іх значную долю складаюць выпускнікі мехмата БДУ.*

*Дзякуй факультэту, дзякуй выкладчыкам, дзякуй лёсу, што ён правёў мяне па гэтым шляху.*

# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар юрыдычных навук прафесар*
*Сяргей Аляксандравіч БАЛАШЭНКА*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8. Тэл./факс 209-52-30 (прыёмная).*
*E-mail: law@bsu.by; www.law.bsu.by*

Юрыдычны факультэт БДУ – гэта прэстыж, творчасць, будучыня, фундаментальныя веды, высокая прафесійная падрыхтоўка!

Выкладчыцкі склад: 18 дактароў навук, прафесараў; 124 кандыдаты юрыдычных навук, дацэнты; 70 выкладчыкаў без вучоных ступеняў.

На факультэце 10 кафедраў, «Юрыдычная клініка» і 3 вучэбныя кабінеты: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, прававой інфарматыкі.

Навучаецца больш за 3 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па трох спецыяльнасцях: **«Правазнаўства»** – кваліфікацыя *«Юрыст»*; **«Паліталогія»** – кваліфікацыя *«Палітолаг-юрыст»* і **«Эканамічнае права»** – кваліфікацыя *«Юрыст з веданнем эканомікі»*. Акрамя дзённай формы навучання, па спецыяльнасці «Правазнаўства» прапануецца завочная і завочная для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю.



На працягу навучання студэнты-прававеды спецыялізуюцца па 10 напрамках: арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў, гаспадарчае права, судова-пракурорска-следчаядзейнасць, адвакатура і натарыят, падатковае і банкаўскае права, параўнальнае правазнаўства, прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці, прававое рэгуляванне фінансаў і крэдыту, палітыка і дзяржаўнае кіраванне, еўрапейскае эканамічнае права.

Вучэбны працэс на юрыдычным факультэце спалучае класічную форму выкладання з новымі адукацыйнымі тэхналогіямі. Факультэт забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, аб'яднанымі лакальнай сеткай. Практычныя навыкі студэнты набываюць на практычных занятках, вучэбных і вытворчых практыках, у «Юрыдычнай клініцы», дзе яны кансультуюць малазабяспечаных грамадзян.

На факультэце створаны ўсе ўмовы для вучэбнай, навуковай дзейнасці і рэалізацыі творчых здольнасцяў студэнтаў. На кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, актыўна дзейнічаюць студэнцкія органы самакіравання, праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых работ, працуе форум на афіцыйным сайце факультэта.

На базе факультэта штогод праводзіцца Беларуская юрыдычная студэнцкая алімпіяда.

На базе музея правазнаўства працуе гісторыка-культурны цэнтр.

Фонд бібліятэкі юрыдычнага факультэта складае звыш 200 тыс. выданняў, у тым ліку і ўнікальных (XVIII – пачатак XX ст.).

Юрыдычны факультэт БДУ сёння – вядучы вучэбны і навуковы цэнтр падрыхтоўкі кадраў прафесіяналаў-юрыстаў, здольных паспяхова вырашаць юрыдычныя задачы дзяржавы і грамадства, працаваць як у сваёй краіне, так і за яе межамі. Нашы выпускнікі працуюць ва ўсіх сферах грамадства: у заканадаўчых і выканаўчых органах улады, у судовай сістэме дзяржавы, у праваахоўных органах, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці. Сярод выпускнікоў – міністры, дэпутаты Нацыянальнага сходу, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый. Сёння выпускнікі факультэта ўзначальваюць Канстытуцыйны, Вярхоўны і Вышэйшы Гаспадарчы суды Рэспублікі Беларусь, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, займаюць кіраўнічыя пасады ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дыплом юрфака БДУ – гарантыя паспяховай кар'еры і максімальнай самарэалізацыі!



***Р.А. Васілевіч,***
*Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, прафесар.*

*– Юрыдычны факультэт БДУ з'яўляецца флагманам падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне правазнаўства нашай краіны.*

*На працягу ўсяго тэрміну існавання заўсёды было прэстыжна набываць веды менавіта на юрфаку. Тут працуюць добрасумленныя і высокаадукаваныя выкладчыкі, імёны многіх з якіх ужо зараз увайшлі ў гісторыю беларускай і замежнай юрыдычнай навукі.*

*Выпускнікі факультэта запатрабаваны ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, працуюць на адказных пасадах у праваахоўных органах, Парламенце, Адміністрацыі Прэзідэнта, судовых органах, адвакатуры. Ад іх дзейнасці залежыць далейшае развіццё працэсу станаўлення Беларусі як сацыяльнай дэмакратычнай прававой дзяржавы.*

*Мне пашанцавала непасрэдна ўдзельнічаць у вучэбна-выхаваўчым працэсе на юрыдычным факультэце ў якасці загадчыка кафедры канстытуцыйнага права і прафесара, спалучаючы сувязь практыкі з навучаннем.*

*Я перакананы, што кожны выпускнік лічыць вялікім гонарам вучобу і працу на юрыдычным факультэце БДУ!*

*Жадаю ўсім вялікіх поспехаў у працы і вучобе, здароўя і шчасця!*



***В. С. Камянкоў,***
*Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыня ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», доктар юрыдычных навук, прафесар.*

*– БДУ – alma mater многіх пакаленняў студэнтаў, найстарэйшая навучальная ўстанова рэспублікі. А яго юрыдычны факультэт – адзін з самых папулярных і прэстыжных.*

*Ён славіцца сваёй шматгадовай гісторыяй, унікальнымі традыцыямі, шырокімі міжнароднымі сувязямі. Высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў – вось адметная рыса юрфака. Яго выпускнікі запатрабаваны ў дзяржаўных органах, у тым ліку ў гаспадарчых судах рэспублікі, міжнародных арганізацыях, адвакацкіх калегіях, буйных прыватных кампаніях, у юрыдычным суправаджэнні бізнесу.*

*Студэнцкія гады – самыя яркія і прадуктыўныя. Гэта час эфектыўных інвестыцый у сваю паспяховую будучыню. Юрысты – гэта эліта беларускай інтэлігенцыі, гарант законнасці і стабільнасці краіны.*

*Як загадчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці і прафесар юрфака БДУ хачу пажадаць будучым студэнтам факультэта здароўя, поспехаў у вучобе і прафесіі!*

# БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – кандыдат біялагічных навук дацэнт Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 10. Тэл.: 209-58-08, 209-59-02, 209-58-05.*
*Факс: 209-58-08. E-mail: bio@bsu.by; www.bio.bsu.by*

На факультэце 9 кафедраў, 7 НДЛ, заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, вучэбная лабараторыя вылічальнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў навучання і вучэбна-навуковы цэнтр «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г.Г. Вінберга». У навучальным працэсе задзейнічаны 2 акадэмікі, 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 22 дактары і 68 кандыдатаў навук.

На факультэце навучаюцца амаль 2000 студэнтаў (дзённая і завочная формы навучання), 12 магістрантаў і 40 аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў на дзённым аддзяленні вядзецца па дзвюх спецыяльнасцях: **«Біялогія»** (напрамкі «Навукова-вытворчая дзейнасць», «Навукова-педагагічная дзейнасць» і «Біятэхналогія») і **«Біяэкалогія»**. Студэнты атрымліваюць адну з 4 кваліфікацый: *«Біёлаг», «Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі», «Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі», «Біёлаг-эколаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі».* На завочным аддзяленні падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па спецыяльнасцях «Біялогія» (напрамкі: «Навукова-вытворчая дзейнасць» і «Навукова-педагагічная дзейнасць») і «Біяэкалогія».

У 2011 г. плануецца адкрыць навучанне студэнтаў па спецыяльнасцях «Біяхімія» і «Мікрабіялогія» з атрыманнем кваліфікацый «Біёлаг. Біяхімік» і «Біёлаг. Мікрабіёлаг» адпаведна.

Студэнты маюць магчымасць займацца навукова-даследчай работай на сучасным узроўні. На факультэце дзейнічаюць дзевяць студэнцкіх навуковых гурткоў, студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя малекулярнай біятэхналогіі.



Выпускнікі факультэта могуць працаваць выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, фармацэўтычнай, біяхімічнай, мікрабіялагічнай і харчовай прамысловасці, на прадпрыемствах, якія вырабляюць касметыку, у экспертна-крыміналістычных цэнтрах, у запаведніках, заказніках, нацыянальных парках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях, у сістэме Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у сістэме Дзяржкамгідрамета і г. д.

Выпускнікі, якія выявілі схільнасць да навуковай работы і высокую эрудыцыю, атрымліваюць рэкамендацыю вучонага савета для паступлення ў магістратуру ці аспірантуру.

Прафесія біёлага – прафесія будучыні. Сардэчна запрашаем на біялагічны факультэт БДУ.

***Галіна Сямейка,***
*кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік ДУ «РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі». Выпускніца 2005 г.*

*– Як выглядае студэнт, які робіць свой выбар на карысць вучобы? Асабліва калі гэта студэнт-біёлаг? Ва ўяўленні многіх гэта такі «батанік», зануда, які нічога не бачыць далей за канспекты і падручнікі і мае любімае месца ў бібліятэцы. Сумна, але сустракаюцца і такія. Відовішча невясёлае, таму што мэта навучання ў гэтым выпадку – толькі высокія балы ў залікоўцы, а потым «чырвоны» дыплом.*

*Насамрэч кожнаму студэнту за час навучання даюцца магчымасці добра даведацца пра розныя сферы дзейнасці, вызначыць свае інтарэсы і выбраць свой напрамак, каб стаць паспяховым чалавекам. Мне пашчасціла працаваць у выдатнай навуковай лабараторыі, стажыравацца ў замежным інстытуце, пабачыць іншыя краіны і сустракацца з замежнымі даследчыкамі, удзельнічаць у канферэнцыях і семінарах.*

*Кожны студэнт можа ўвабраць самае лепшае, неабходна толькі вялікае жаданне і намаганні для яго рэалізацыі.*



***Марыя Трубіцына,***
*аспірантка Эдынбургскага ўніверсітэта (The University of Edinburgh), аддзяленне малекулярнай і клетачнай біялогіі (Institute of Cell and Molecular Biology). Выпускніца 2009 г.*

*– Я пайшла на біяфак, таму што маімі любімымі прадметамі былі біялогія, хімія, фізіка і матэматыка. Не магу сказаць, што вучыцца было лёгка, але вельмі цікава, займальна. Матэрыял быў надзвычай разнастайны. Біялагічны факультэт даў мне вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі таксама па англійскай мове, інфарматыцы і матэматыцы. Вялікая колькасць практычных заняткаў па многіх прадметах робіць навучанне больш наглядным і запамінальным.*

*На працягу навучання я выступала на міжнародных канферэнцыях па прыродазнаўчых навуках, дзе рабіла даклады ў тым ліку і на англійскай мове.*

*Гэтыя пяць гадоў былі незабыўнымі, яны адкрылі мне вялікія перспектывы ў жыцці, дапамаглі развіцца як асобе і знайсці сваё пакліканне ў жыцці.*

# ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, намеснік першага прарэктара БДУ па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях Павел Аляксеевіч МАНДРЫК*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4. Тэл. 209-52-45, факс: 226-55-48.*
*E-mail: dean_office_FPMI@bsu.by; www.fpmi.bsu.by*

ФПМІ заснаваны 1 красавіка 1970 г.

Выкладчыцкі склад налічвае больш за 150 чалавек, сярод якіх 2 акадэмікі, 2 членыкарэспандэнты НАН Беларусі, 33 прафесары і дактары навук, каля 100 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На факультэце дзейнічаюць 12 кафедраў, навучаюцца каля 1200 студэнтаў.

За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў больш за 9 тыс. спецыялістаў, якія складаюць кадравую аснову многіх вядучых арганізацый краіны ў галіне інфармацыйных тэхналогій і адпаведных падраздзяленняў прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку з Парка высокіх тэхналогій, навуковых устаноў, банкаў, страхавых кампаній, навучальных устаноў.

Спецыяльнасці факультэта: **«Прыкладная матэматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-прагарміст»*), **«Інфарматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык – сістэмны праграміст»*), **«Эканамічная кібернетыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-эканаміст»*), **«Актуарная матэматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-фінансіст»*), **«Камп'ютарная бяспека»** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па ахове інфармацыі. Матэматык»*), **«Прыкладная інфарматыка»** (кваліфікацыя *«Інфарматык. Спецыяліст па распрацоўцы праграмнага забяспячэння»*).



Незалежна ад спецыяльнасці выпускнікі факультэта могуць займацца праблемна-аналітычнай, навукова-даследчай, арганізацыйна-кіраўніцкай і практычнай дзейнасцю, звязанай з праектаваннем, распрацоўкай, эксплуатацыяй і суправаджэннем прыкладнога і сістэмнага праграмнага забеспячэння.

Студэнцкае жыццё факультэта насычана яркімі падзеямі. Штогод шырока святкуюцца Дні ФПМІ, у якіх студэнты ўдзельнічаюць разам з выкладчыкамі. Падчас студэнцкіх святаў ладзяцца канцэрты факультэцкай каманды КВЗ. Апошнія навіны можна прачытаць у штомесячнай газеце «ФПМы» і на сайце факультэта.

Іншагароднім студэнтам даецца месца ў інтэрнаце № 6, дзе існуе сертыфікаваная камп'ютарная сетка, якая дазваляе непасрэдна з пакоя падключаць два камп'ютары да адукацыйных сервераў факультэта з выхадам у інтэрнэт.

На факультэце дзейнічае сістэма бесперапыннай адукацыі, арыентаванай на прадметы «Матэматыка» і «Інфарматыка». Сістэма ўключае пастаянна дзейныя школы для юнацтва (вочную і вочна-завочную, пачынаючы з 5-га класа школы) і мерапрыемствы алімпіяднаконкурснага і навучальнага характару (алімпіяды, канферэнцыі, вучэбныя зборы рознага ўзроўню і накіраванасці, летнія школы і г. д.).

Штогод нашы студэнты ўдзельнічаюць у міжнародных студэнцкіх алімпіядах па праграмаванні і матэматыцы і дэманструюць нязменна высокі ўзровень падрыхтоўкі. Каманды БДУ ў складзе студэнтаў ФПМІ шматразова былі фіналістамі каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM ICPC). Найвышэйшага поспеху наша каманда дасягнула ў 2004 г., калі заваявала залаты медаль і ў 2008 г. – бронзавы. На студэнцкіх алімпіядах па матэматыцы з 2001 г. студэнты ФПМІ заваявалі 36 залатых, 22 срэбраныя і 5 бронзавых медалёў, а ў 2003 і 2005 гг. узялі першыя месцы ў агульнакамандным спаборніцтве.

Запрашаем усіх зацікаўленых на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а навучэнцаў 5–11-х класаў – у нашыя школы для юнацтва, а таксама ў цэнтр па рабоце з адоранымі школьнікамі (»ЮНІ-цэнтр–XXI»).



***А.В. Тузікаў**, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі, доктар фіз.-мат. навук. Выпускнік 1980 г.*

– ФПМІ з моманту свайго заснавання быў і застаецца сапраўдным лідарам у краіне па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Высокая якасць адукацыі – на ўзроўні самых прэстыжных сусветных стандартаў – заснавана перш за ўсё на высокапрафесійных спецыялістах, якія працуюць на факультэце, але таксама ў вялікай ступені на скрупулёзным адборы абітурыентаў. Усё гэта дазваляе студэнтам ФПМІ дамагацца выдатных вынікаў у сваёй кар'еры: як у навуковай, так і ў прафесійнай. Нездарма попыт на выпускнікоў ФПМІ не проста высокі – у любой арганізацыі кожны кіраўнік (навуковая ўстанова, ВНУ, банк або IT-кампанія) ведае: любы выпускнік ФПМІ адразу і лёгка ўключаецца ў самую складаную працу і дамагаецца поспеху.



***Сяргей Гвардзейцаў**, ген. дырэктар кампаніі «Ітранзішн». Выпускнік 1996 г.*

– ФПМІ – гэта не толькі аснова ўсіх ведаў і ўменняў, атрыманых мной у галіне матэматыкі і інфарматыкі, але часта і крыніца новых ідэй для стварэння новага ў любой галіне: у прыкладной матэматыцы, у IT-сферах, у навуцы, у бізнесе. Так стваралася і мая кампанія – усё пачыналася з навучальнага курса для «прасунутых» студэнтаў, потым на гэтай аснове былі створаны калектывы, які паклаў пачатак існаванню кампаніі пад назвай «Ітранзішн». Зараз гэта вельмі паспяховая кампанія, якая працягвае актыўнае супрацоўніцтва з ФПМІ і бачыць у гэтым адзін з фактараў свайго поспеху. Разам з факультэтам мы пабудавалі некалькі лабараторый, распрацавалі шэраг навучальных курсаў, сумесна працуем над развіццём студэнцкага руху як у алімпіядах і ў навуковай творчасці, так і ў далейшым працаўладкаванні выпускнікоў.

# ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – кандыдат тэхнічных навук дацэнт Уладзімір Яўгенавіч ГУРСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 209-59-11, 209-59-09.*
*E-mail: hurski@bsu.by; www. gumf.bsu.by*

Гуманітарны факультэт ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасцях: **«Дызайн»** (напрамак «Камунікатыўны дызайн»); **«Сучасныя замежныя мовы»** (напрамак «Пераклад»; напрамак «Выкладанне» – спецыялізацыі «Камп'ютарная лінгвістыка» і «Камп'ютарнае навучанне мовам»); **«Прыкладная інфарматыка»** (напрамак – вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн); **«Сацыяльная работа»** (напрамак – сацыяльна-педагагічная дзейнасць); **«Культуралогія»** (спецыялізацыі «Амерыканістыка і англійская мова», «Германістыка і нямецкая мова», «Гебраістыка і англійская мова»); **«Менеджмент»** (спецыялізацыя «Сацыяльны менеджмент»).

Гуманітарны факультэт забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў якасна новага ўзроўню. На ўсіх спецыяльнасцях студэнты паглыблена знаёмяцца з камп'ютарнымі тэхналогіямі, таму што ўзрастае роля камп'ютараў і тэхнічных сродкаў пры арганізацыі дзейнасці любога спецыяліста. Таксама студэнты паглыблена вывучаюць замежныя мовы, што абумоўлена працэсамі глабалізацыі, неабходнасцю актывізаваць узаемадзеянне з замежнымі партнёрамі.

Пры падрыхтоўцы дызайнераў асаблівая ўвага надаецца безаналагаваму інавацыйнаму праектаванню, развіццю навыкаў творчага падыходу да праектавання штучнага асяроддзя. Спецыяліст у галіне дызайну мае права займаць такія пасады, як мастак-канструктар (дызайнер), мастак, мастак па рэкламе і афармленні вітрын.

Будучыя спецыялісты па камп'ютарным навучанні мовам змогуць не толькі выкладаць замежную мову, але і быць аўтарамі камп'ютарных курсаў па навучанні мове. Яны могуць займаць пасады выкладчыка, малодшага навуковага супрацоўніка, перакладчыка, рэдактара-перакладчыка, рэдактара-стыліста і інш.



Напрамак вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн) прадугледжвае акрамя асноўных дысцыплін праграмавання дысцыпліны мастацкай накіраванасці кшталту «Тэорыя і метадалогія дызайну», «Псіхалогія ўспрымання візуальнай інфармацыі», «Колеразнаўства і каларыстыка» і інш. Спецыяліст можа займаць такія пасады, як інжынер-праграміст, матэматык, інжынер-даследчык, малодшы навуковы супрацоўнік і інш.

Вядзецца падрыхтоўка сучасных сацыяльных работнікаў, спецыялістаў, якія маюць высокую псіхалагічную кампетэнцыю, спецыяльныя веды ў галіне сацыяльнай інжынерыі і тэхналогіі, прававых, псіхалагічных і маральных асаблівасцяў жыццядзейнасці чалавека. Спецыяліст у галіне сацыяльнай работы мае права займаць такія пасады, як сацыяльны педагог, сацыяльны псіхолаг, навуковы супрацоўнік, інструктар па працоўнай тэрапіі, інспектар па ахове дзяцінства, інструктар па арганізацыйна-масавай рабоце, выхавальнік інтэрната, кансультант у сферы прафесійнага адбору.

Менеджмент сацыяльнай сферы прадугледжвае кіраўнічае эканамічнае забеспячэнне пры арганізацыі медыка-сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Менеджар-эканаміст – гэта спецыяліст шырокага профілю з рознабаковай эканамічнай і прававой падрыхтоўкай. Аб'ектамі яго прафесійнай дзейнасці з'яўляюцца навуковыя арганізацыі, кансультацыйныя фірмы, аналітычныя падраздзяленні ўстаноў і прадпрыемстваў, органаў сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, сферы паслуг.



***Паліна Хонькіна**, студэнтка 5 курса спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (камп'ютарная лінгвістыка)», стыпендыятка імяннной стыпендыі імя К. Крапівы, старшыня савета па якасці адукацыі БДУ, член вучонага савета факультэта, член Вучонага савета БДУ.*

*– Гумфак аб'яднаў у сабе інавацыйныя спецыяльнасці, якія не толькі адпавядаюць патрабаванням часу, але і з'яўляюцца вельмі запатрабаванымі на рынку працы. Матэрыяльна-тэхнічная база, спрыяльная атмасфера факультэта і абачлівае кіраўніцтва выкладчыцкага складу ствараюць неабходныя ўмовы для плённай дзейнасці студэнтаў і аптымізацыі навучальнага працэсу. Студэнтам даецца магчымасць займацца даследчай работай, прымаць удзел у дзейнасці грамадскіх арганізацый і органах студэнцкага самакіравання, займацца творчасцю. Нягледзячы на малады ўзрост, на факультэце ўжо паспелі скласціся свае традыцыі, якія сталі асновай умацавання карпаратыўнага духу студэнцтва. Штогадовыя мерапрыемствы культурна-масавага і навуковага характару – шанц праявіць усе свае таленты, дасягнуць новых вышынь і проста правесці час з карысцю. За час навучання я толькі яшчэ мацней пераканалася ў правільнасці выбару.*

# ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар геаграфічных навук прафесар Іван Іванавіч ПІРОЖНІК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16. Тэл. 209-52-57, факс 209-50-15.*
*E-mail: geo@bsu.by; www.geo.bsu.by*

На геаграфічным факультэце існуюць наступныя спецыяльнасці і спецыялізацыі.

**Геаграфія.** Напрамак «Навукова-педагагічная дзейнасць» Спецыялізацыі: геаграфія турызму і экскурсійны менеджмент; эканамічная геаграфія; дэмаграфія; геаграфія глебаў, зямельных рэсурсы і меліярацыя; картаграфія; рэгіянальная сацыяльна-эканамічная геаграфія; рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды; біягеаграфія.

Напрамак «Геаінфармацыйныя сістэмы».

Напрамак «Гідраметэаралогія». Спецыялізацыі: гідралогія сушы; метэаралогія; аграметэаралогія.

Напрамак «Касмааэракартаграфія» – плануецца набор з 2011 года.

**Геаграфічная экалогія.** Спецыялізацыі: ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; маніторынг навакольнага асяроддзя, геаэкалагічны менеджмент.

**Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў.** Спецыялізацыі: геалагічная здымка, пошук і разведка радовішчаў карысных выкапняў; гідрагеалогія і інжынерная геалогія.

Выпускнікі геаграфічнага факультэта могуць атрымаць наступныя кваліфікацыі: *«Географ. Выкладчык геаграфіі»* («Геаграфія», напрамак «Навукова-педагагічная дзейнасць»), *«Географ. Гідраметэаролаг»* («Геаграфія», напрамак «Гідраметэаралогія»), *«Географ. Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах»* («Геаграфія» напрамак «ГІС»). *«Географ-эколаг. Выкладчык геаграфіі і экалогіі»* («Геаэкалогія»), *«Інжынер-геолаг»* («Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў»), *«Географ. Картограф»* («Геаграфія», напрамак «Космааэракартаграфія»).



Географы і геаэколагі могуць працаваць ва ўстановах Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навукова-даследчых і праектных інстытутах і прадпрыемствах прыродазнаўчага, водагаспадарчага, меліярацыйнага, турысцка-экскурсійнага і сацыяльна-эканамічнага профіляў, а таксама выкладаць геаграфію і экалогію ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.

Кваліфікацыя «Географ. Спецыяліст па ГІС» адкрывае шырокія магчымасці для атрымання тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі па прымяненні інфармацыйных тэхналогій у галіне землекарыстання, геадэзіі і картаграфіі. Выпускнікі напрамку «ГІС» размяркоўваюцца ў сістэму Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь, у падведамасныя навуковыя і вытворчыя прадпрыемствы і арганізацыі («Белгеадэзія», «Белкартаграфія», «Белдзіпразем»).

Спецыялісты-гідраметэаролагі запатрабаваны ў сістэме Дэпартамента гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навуковых і вытворчых прадпрыемствах і ўстановах.

Інжынеры-геолагі працуюць у структурных падраздзяленнях Дэпартамента па геалогіі Мінпрыроды, РУП «Белгеалогія», у навуковых і праектных інстытутах.

Картографы працуюць у вытворчых прадпрыемствах і арганізацыях Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі («Белгеадэзія», «Белкартаграфія», «Аэракосмагеадэзія», «Картгеацэнтр»), праектных арганізацыях Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры.



***Рыгор Пасрэднік,*** *старшыня Студэнцкага саюза геаграфічнага факультэта, студэнт 5 курса, дэлегат IV Усебеларускага народнага сходу.*

*– Выбар факультэта не быў для мяне доўгім, і ў далейшым пра гэта я ні разу не пашкадаваў. Геафак дае магчымасць атрымаць веды па ўсіх сферах жыцця, асаблівы светапогляд, рамантыку прыгод і падарожжаў.*

*Вось ужо на працягу больш як 75 гадоў геаграфічны факультэт з'яўляецца вядучым факультэтам БДУ. Нясціпла, але факт. Многія гады студэнты-географы выяўлялі сябе як выдатныя спартсмены, артысты, грамадскія дзеячы на агульнаўніверсітэцкім узроўні, рэспубліканскім і нават сусветным. І, вядома ж, выпускнікі геафака з'яўляюцца добрымі спецыялістамі ў сваёй справе, незалежна ад таго, дзе і кім яны працуюць. Факультэт дае многае, галоўнае – хацець гэта атрымаць і прыкласці намаганні. Нават такі выдатны факультэт, як наш, так проста нічога не дасць, ён просіць узамен стараннасці, жадання вучыцца, ведаў і працы.*

# ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

*Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 25. Тэл. 284-26-82, факс 284-00-04.*
*E-mail: fir@bsu.by; www.fir.bsu.by*

ФМА створаны 1 кастрычніка 1995 г. На факультэце навучаецца звыш 2,5 тысяч студэнтаў, у тым ліку 274 замежныя грамадзяніны. ФМА падрыхтаваў каля 4 тысяч спецыялістаў. 20 % супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў Беларусі з'яўляюцца нашымі выпускнікамі.

На кафедрах факультэта працуюць вядомыя навукоўцы, адзначаныя прэстыжнымі айчыннымі і міжнароднымі прэміямі.

**Спецыяльнасць «Міжнародныя адносіны»**

Падрыхтоўка прадугледжвае вывучэнне сучаснай міжнароднай палітыкі і эканомікі, базавых прынцыпаў і напрамкаў знешняй палітыкі Беларусі, а таксама іншых краін. Студэнты паглыблена вывучаюць дзве замежныя мовы. Даецца кваліфікацыя *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*. Яны працуюць у МЗС, іншых міністэрствах і ведамствах Беларусі, прадстаўніцтвах міжнародных арганізацый і замежных кампаній, СМІ і грамадскіх арганізацыях, а таксама знешнегандлёвых падраздзяленнях.

**Спецыяльнасць «Менеджмент»**

(напрамак – менеджмент у сферы міжнароднага турызму)

Папулярнасць гэтай спецыяльнасці сярод моладзі расце з кожным годам. Выпускнікі атрымліваюць унікальную кваліфікацыю *«Менеджар-эканаміст. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моў)»*. Гэта дае ім магчымасць працаваць у турыстычнай індустрыі, банкаўскай сферы, знешнеэканамічных падраздзяленнях прадпрыемстваў і арганізацый.

**Спецыяльнасць «Міжнароднае права»**

Спецыялізацыі: міжнароднае публічнае права, міжнароднае прыватнае права, еўрапейскае права.

Даецца кваліфікацыя *«Юрыст-міжнароднік з веданнем замежных моў»*. Гэта спецыялісты шырокага юрыдычнага профілю, якія маюць уяўленне пра цяперашні сусветны правапарадак, свабодна валодаюць сучаснымі метадамі аналізу і вырашэння прававых праблем. Выпускнікі запатрабаваныя ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання, а таксама ў міжнародных арганізацыях і ўстановах.

**Спецыяльнасць «Сусветная эканоміка»**

Студэнты вывучаюць механізм функцыянавання сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносін, міждзяржаўнай і рэгіянальнай палітыкі, а таксама дзейнасць міжнародных арганізацый. Выпускнікі могуць працаваць у міждзяржаўных органах, замежных прадстаўніцтвах, міжнародных фінансава-эканамічных арганізацыях, а таксама міністэрствах і ведамствах, якія займаюцца распрацоўкай і правядзеннем макраэканамічнай і знешнеэканамічнай палітыкі. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю *«Эканаміст» з дадатковым сертыфікатам «Перакладчык-рэферэнт»*.

**Спецыяльнасць «Лінгвакраіназнаўства»**

Лінгвакраіназнаўства – спецыяльнасць, прызначаная для падрыхтоўкі спецыялістаў шырокага профілю па ўсходазнаўчых дысцыплінах.

Студэнты атрымліваюць глыбокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку па адной з усходніх моў, гісторыі, палітыцы, эканоміцы, геаграфіі і культуры краіны, мову якой вывучаюць (Кітай, Карэя, Турцыя, Іран і іншыя краіны).

Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю *«Усходазнаўца-міжнароднік. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*. Такія спецыялісты могуць працаваць не толькі перакладчыкамі, але і кансультантамі па краіне і рэгіёне, а таксама выкладчыкамі рускай мовы як замежнай.

**Спецыяльнасць «Мытная справа»**

Спецыялізацыі: прававое забеспячэнне мытнай дзейнасці, эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці.

Акрамя агульнапрафесійных дысцыплін, студэнты атрымліваюць спецыяльныя веды па вядзенні знешнегандлёвай, фінансавай і валютна-крэдытнай дзейнасці. Даецца кваліфікацыя *«Спецыяліст мытнай справы»* з дадатковым сертыфікатам «Перакладчык-рэферэнт». Выпускнікі запатрабаваныя ў мытных органах, дзяржаўных і камерцыйных структурах, якія ажыццяўляюць знешнеэканамічныя сувязі.



**Уладзімір Васількоў**, выпускнік 2006 г. У 2006–2010 гг. працаваў журналістам у інфармагенцтве «БелТА». З 2010 г. – на дыпламатычнай службе; першы сакратар галоўнага ўпраўлення Еўропы МЗС Беларусі.

– Alma mater запомнілася жывымі, займальнымі і творчымі зносінамі з вельмі цікавымі людзьмі – я маю на ўвазе як выкладчыкаў, так і аднакурснікаў. Для прыроджанага гуманітарыя, які любіць палітыку і размаўляе са светам людзей на «ты», ФМА БДУ – не толькі жыватворны навуковы аазіс, але і выдатны падмурак карысных чалавечых кантактаў, свайго роду школа камунікацыі. Гэта ўнікальнае месца, дзе кожны студэнт можа – хоць бы ў форме ролевай гульні – адчуць сябе датычным да рашэння сусветных лёсаў. А гэта вялікае задавальненне для сапраўдных гурманаў.



**Вікторыя Дзядок**, выпускніца 2006 г., магістратуры 2007 г. Працавала ў гасцініцах «Арбіта», «Вікторыя». З 2009 г. – менеджар па продажах і маркетынгу атэля Crowne Plaza Minsk.

– З навучаннем на ФМА БДУ звязаны самыя станоўчыя ўспаміны. Пісьменна і цікава пабудаваны навучальны працэс, высокакваліфікаваныя выкладчыкі, эрудзіраваныя аднакурснікі, а таксама шматлікія магчымасці для развіцця творчых здольнасцяў асобы. Асаблівае навуковае, культурнае і прафесійнае асяроддзе на ФМА дазваляе сфарміраваць сапраўдных прафесіяналаў, якія валодаюць шырокім кругаглядам і ўмеюць пастаянна развівацца, адаптавацца, асвойваць новыя галіны і тэхналогіі. Менавіта такія спецыялісты будуць заўсёды запатрабаваны на рынку працы.



# ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар хімічных навук прафесар Дзмітрый Вадзімавіч СВІРЫДАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14. Тэл. 200-69-18, 209-52-53.*
*E-mail: chem@bsu.by; www.chemistry.bsu.by*

Хімічны факультэт, заснаваны ў 1931 г., з'яўляецца вядучым вучэбным і навуковым цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў-хімікаў вышэйшай кваліфікацыі. Нашы выпускнікі працуюць у Нацыянальнай акадэміі навук, навукова-даследчых і праектных інстытутах, ВНУ, на многіх прадпрыемствах хімічнай прамысловасці. Шмат хімікаў-даследчыкаў і хімікаў-педагогаў працуе за мяжой у вядучых установах і фірмах, дзейнасць якіх звязана з хіміяй.

У структуры факультэта 7 кафедраў. Працуе 25 дактароў і 79 кандыдатаў навук. Факультэт плённа супрацоўнічае з НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, інстытутамі НАН Беларусі, дзе студэнты ў рамках спецыяльных курсаў знаёмяцца з перадавымі даследаваннямі, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы, удзельнічаюць у выкананні навуковых тэм.

Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўляецца па спецыяльнасці **«Хімія»** па чатырох напрамках: навукова-вытворчая дзейнасць, навукова-педагагічная дзейнасць, фармацэўтычная дзейнасць і ахова навакольнага асяроддзя. Выпускнікі атрымліваюць адну з чатырох кваліфікацый: *«Хімік. Даследчык», «Хімік. Выкладчык хіміі», «Хімік. Хімік-эколаг» і «Хімік. Хімік-фармацэўт».* Двайная кваліфікацыя дае права кожнаму выпускніку займацца як навуковай дзейнасцю ў галіне хіміі, так і працаваць па спецыяльнасці ў залежнасці ад абранага напрамку. Студэнты навукова-вытворчага і навукова-педагагічнага напрамкаў маюць магчымасць з IV курса выбіраць адну са спецыялізацый: аналітычная хімія, неарганічная хімія, арганічная хімія, фізічная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, хімія цвёрдага цела і паўправаднікоў, электрахімія. З 2008 г. на напрамку «навукова-вытворчая дзейнасць» ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў для навуковага суправаджэння і забеспячэння працы АЭС (спецыялізацыі: радыяцыйная хімія і радыяхімія). На напрамку «фармацэўтычная дзейнасць» студэнты могуць спецыялізавацца па хіміі лекавых прэпаратаў або па тэхналогіі лекавых сродкаў. На напрамку «ахова навакольнага асяроддзя» прапануецца спецыялізацыя па хімічнай экалогіі.

Навучальны працэс скіраваны на развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў, умення самастойна будаваць сваю адукацыйную траекторыю, пастаянна папаўняць і абнаўляць сваю прафесійную кампетэнцыю. Таму многія нашы выпускнікі сталі банкірамі, дыпламатамі, крыміналістамі, кіраўнікамі, менеджарамі – г. зн. лёгка ўвайшлі ў разнастайныя прафесіі і сферы дзейнасці і дасягнулі ў іх значных поспехаў.

Факультэт мае дастатковую колькасць аўдыторый, сучасныя вучэбныя лабараторыі, два камп'ютарныя класы, уласную бібліятэку. Дзейнічаюць тры СНДЛ.

Выпускнікі факультэта маюць шырокія магчымасці ў выбары сваёй прафесійнай дзейнасці ў акадэміі навук, даследчых і інжынерных цэнтрах прадпрыемстваў, хімічных лабараторыях буйных прамысловых аб'яднанняў, радыёэлектроннай і фармацэўтычнай прамысловасці, а таксама ўсюды, дзе выкарыстоўваюцца хімічныя тэхналогіі. Людзі, схільныя да выкладчыцкай дзейнасці, могуць рэалізаваць сябе ў навучальных установах. І не толькі ў Беларусі.

Мы чакаем вас на хімічным факультэце, і вы не пашкадуеце, прыйшоўшы навучацца да нас.





***Кацярына Скорб,*** *асістэнт кафедры неарганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук, лаўрэат стыпендыі Прэзідэнта РБ маладым вучоным.*

*– Хімфак – гэта вялізны калектыў высокапрафесійных выкладчыкаў, гэта верныя і добрыя сябры на ўсё жыццё, гэта САПРАЎДНАЯ спецыяльнасць. Зараз сфер прыкладання хімікаў велізарная колькасць – гэта і экалогі, і фармацэўты, і настаўнікі, і інжынеры, і даследчыкі, і многія іншыя. Але самае галоўнае тое, што хімічны факультэт – скарбніца магчымасцяў, якія адкрываюцца перад табой па яго заканчэнні. Ты малады, разумны і мэтанакіраваны – перад табой адкрыты ўсе гарызонты. Будзь самім сабой і будзь такім, як мы – хімікі!*



***Дзмітрый Шчукін,*** *загадчык сектара Інстытута М. Планка па вывучэнні калоідаў і міжфазавых паверхняў, Германія.*

*– Для многіх хлопцаў і дзяўчат кожны год хімічны факультэт БДУ (які мне пашчасціла скончыць у 1998 г.) становіцца той адпраўной кропкай, пасля якой яны ператвараюцца ў кампетэнтных і вельмі інтэлігентных людзей. Бо хімік – гэта не проста прафесія. Гэта хобі, гэта пакліканне, а для большасці з іх гэта жыццё. Дзе б ні працаваў хімік, кім бы ён ні быў, яго адрознівае розум, напорыстасць, мэтанакіраванасць і незвычайнае ўменне выйсці пераможцам з любой сітуацыі. Менавіта гэтаму і навучылі нас нашы выкладчыкі на хімічным факультэце. Хімфак – гэта вялікая сям'я, поўная добразычлівасці і паважлівых адносін, якія вы цалкам зможаце адчуць, паступіўшы на факультэт.*

# ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК

*Дэкан – доктар сацыялагічных навук прафесар Анатоль Уладзіміравіч РУБАНАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9. Тэл./факс 259-70-47.*
*E-mail: phse@bsu.by; www.ffsn.bsu.by*

ФФСН мае 4 аддзяленні дзённай формы навучання – філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, інфармацыі і камунікацыі (напрамак – сацыяльныя тэхналогіі) і 2 аддзяленні завочнай формы навучання – філасофіі і сацыялогіі.

На аддзяленні **філасофіі** вядзецца падрыхтоўка па спецыялізацыях «Анталогія і тэорыя пазнання», «Сацыяльная філасофія», «Філасофія культуры».

Студэнты аддзялення атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку ў галіне прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навук, авалодваюць ведамі па гісторыі філасофіі і культуры, логіцы, псіхалогіі, шырокім коле напрамкаў сучаснай філасофіі. Даецца кваліфікацыя «Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін».

На аддзяленні **сацыялогіі** вядзецца падрыхтоўка па спецыялізацыях «метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання», «сацыялогія кіравання». Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «палітычная сацыялогія». Вялікая ўвага надаецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Спецкурсы прысвячаюцца вывучэнню праблем працы, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г. д. Даецца кваліфікацыя *«Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін».*

Аддзяленне **псіхалогіі** забяспечвае падрыхтоўку па спецыялізацыях «Медыцынская псіхалогія» і «Сацыяльная псіхалогія». Даецца кваліфікацыя *«Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі».*

Медыцынскія псіхолагі атрымліваюць спецыяльныя веды па нейрапсіхалогіі, псіхасаматыцы, псіхафармакалогіі, псіхалогіі паводзін з адхіленнямі, анамаліях псіхічнага развіцця дзіцяці, яго дыягностыцы і карэкцыі. Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «псіхалогія здароўя», дзе акцэнт будзе зроблены на навучанне метадам прафілактыкі захворванняў, фарміраванне здаровага ладу жыцця, пазбаўлення шкодных звычак.

Сацыяльныя псіхолагі вывучаюць сучасныя праблемы сусветнай сацыяльнай псіхалогіі, псіхалогіі працы і кіравання, псіхалогіі камунікацый, псіхалагічныя асновы работы з кадрамі, а таксама авалодваюць навыкамі правядзення сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу, сямейнага кансультавання. Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «арганізацыйная псіхалогія», дзе акцэнт будзе зроблены на прымяненні псіхалагічных тэорый і даследчых методык да праблем арганізацыі, кіравання і бізнесу, пытанні падбору персаналу, матывацыі, навучання і развіцця супрацоўнікаў, арганізацыйных паводзінаў і інш.

Аддзяленне **інфармацыі і камунікацыі** (напрамак – сацыяльныя тэхналогіі, навукова-педагагічная дзейнасць) вядзе падрыхтоўку па дзвюх спецыялізацыях – «Інфармацыя і камунікацыя ў арганізацыях» і «Інфармацыя і камунікацыя ў сістэмах масавых паводзін». Даецца кваліфікацыя «*Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі. Выкладчык сацыяльна-палітычных дысцыплін*».

Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «маркетынгавыя камунікацыі і даследаванні», у рамках якой будзе ажыццяўляцца паглыбленае вывучэнне рынкаў, паводзінаў спажыўцоў, механізмаў фарміравання попыту, эфектыўных формаў прасоўвання тавараў, рэкламнай і выставачнай дзейнасці, PR, медыяпланавання.

На факультэце традыцыйна святкуюцца Дзень першакурсніка, Дзень студэнта, Дзень факультэта, Дзень нараджэння ўніверсітэта, выбіраюцца Міс і Містар ФФСН. Штогод праводзяцца турніры па футболе, валейболе, шахматах, восеньскі турыстычны злёт.

Традыцыйнымі сталі навуковыя канферэнцыі, якія прыцягваюць мноства слухачоў і ўдзельнікаў з іншых факультэтаў і ўніверсітэтаў.

Студэнты і аспіранты ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах «Эразмус Мундус», «Капернікус», праектах Вышаградскай групы і інш.





***Антон Федасенка,*** *студэнт 5 курса аддзялення філасофіі ФФСН.*

*– Знаходзячыся ўжо практычна на фінішы навучання, магу сказаць, што вучоба на ФФСН дала мне многае. Акрамя атрымання адукацыі на адным з самых прэстыжных факультэтаў БДУ, я набыў навыкі зносін, паспрабаваў сябе ў пазанавучальнай дзейнасці. На працягу ўсяго навучання я з'яўляюся старастам групы і членам прафсаюзнага камітэта факультэта. Грамадская дзейнасць дапамагае завесці вялізную колькасць новых знаёмстваў і прывучае да адказнасці за свае рашэнні.*

*Не магу сказаць, што вучыцца на нашым факультэце вельмі лёгка. Любое вучэнне патрабуе старання і ўседлівасці. Але ведаю, што, калі студэнт добрасумленна ставіцца да вучобы і хоча разабрацца ў прадмеце, выкладчыкі заўсёды прыйдуць на дапамогу.*

*Увогуле, студэнцкія гады – гэта не проста засваенне ведаў, але і набыццё сяброў, адпачынак, асобасны рост.*

# ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ***
***Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 227-60-25, 226-12-92.***
***E-mail: economics@bsu.by; www.economy.bsu.by***

Эканамічны факультэт заснаваны 1 сакавіка 1999 г. і працягвае слаўныя традыцыі падрыхтоўкі эканамістаў у БДУ. У 1925 г. менавіта эканамісту быў выдадзены дыплом БДУ № 1. Сёння на факультэце на ўсіх формах навучаюцца каля 2000 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў. Вучацца не толькі беларусы, але і звыш 400 замежных грамадзян з 20 краін свету. На 5 кафедрах працуюць 74 штатныя выкладчыкі, з якіх 8 прафесараў і дактароў навук, 35 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Па сумяшчальніцтве на факультэце працуе шэраг вядомых навукоўцаў-практыкаў, кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў міністэрстваў, банкаў, дзяржаўных устаноў, кансалтынгавых фірмаў.

Абітурыенты паступаюць на чатыры аддзяленні: **эканамічная тэорыя** (спецыялізацыя «Эканамічная палітыка», кваліфікацыя *«Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін»*), **эканоміка** (спецыялізацыя «Аналітычная эканоміка», кваліфікацыя *«Эканаміст-аналітык»*), **фінансы і крэдыт** (спецыялізацыя «Банкаўская справа», кваліфікацыя *«Эканаміст»*) і **менеджмент** (спецыялізацыя «Міжнародны менеджмент», «Інавацыйны менеджмент», кваліфікацыя *«Эканаміст-менеджар»*).



Першыя два гады ўсе студэнты атрымліваюць фундаментальную эканамічную (макра-, мікра-, агра-, міжнародную, рэгіянальную), фінансавую (бухулік і аўдыт, карпаратыўныя фінансы, бізнес-планаванне, інвестыцыйны аналіз), а таксама інструментальную падрыхтоўку (матэматыка, інфарматыка, базы даных, статыстыка, эканаметрыка, прыняцце рашэнняў, лагістыка) .

Паглыбленае вывучэнне пачынаецца з II–III курса ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю. Пасля чатырох гадоў навучання замежныя студэнты маюць магчымасць здаць выпускны іспыт і атрымаць дыплом бакалаўра. Пасля мотожна працягваць навучанне па магістарскіх праграмах, якіх на факультэце чатыры.

Выпускнікі з дыпломам магістра могуць паступіць у аспірантуру, абараніць дысертацыю і папоўніць эліту нацыянальнай эканамічнай навукі. На эканамічным факультэце шмат увагі надаецца вывучэнню англійскай мовы, аднак зацікаўленыя могуць вывучаць і нямецкую мову як мову нашых найважнейшых гандлёвых партнёраў. Многія студэнты навучаюцца адзін ці два семестры за мяжой, прымаюць удзел у сумесных праектах кшталту «Нямеччыя інвестыцыі ў Беларусі» (з Анхальцкім універсітэтам прыкладных навук, ФРГ), «Беларусь-Галандыя: знешнеэканамічнае супрацоўніцтва» (з інстытутам менеджменту FONTYS, Галандыя), а таксама ў праектах з універсітэтамі Магдэбурга і Франкфурта (Германія). Мы супрацоўнічаем з эканамічнымі факультэтамі МДУ і Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэтаў, Кіеўскай школай эканомікі і інш.

На факультэце па замове шэрагу фірмаў, банкаў, прадпрыемстваў актыўна займаюцца навукова-практычнай работай у галіне бізнес-планавання, кансалтынгу, электроннага бізнесу, маркетынгавых даследаванняў. Мы маем уласныя карпункты часопісаў «Вестник Ассоциации белорусских банков», «Банковский вестник», «Финансы, учет, аудит».

Дапаможа выпускнікам адаптавацца да практычнай работы вучэбная і вытворчая практыка па статыстыцы, фінансах, макра- і мікраэканоміцы, міжнародным менеджменце – як у дзяржаўных установах, так і на найлепшых айчынных і замежных прадпрыемствах, у фірмах і банках. Такое ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі дазваляе яшчэ задоўга да заканчэння ўніверсітэта наладзіць кантакт і знайсці месца працы, якое найбольш адпавядае здольнасцям выпускніка. Добра падрыхтаванаму эканамісту няцяжка знайсці працу, але мы ставім больш складаную задачу: дапамагчы нашым выхаванцам знайсці добрую, цікавую, высокааплатную працу. З гэтай мэтай створана кадравае агенцтва.

Эканамічны факультэт – сучасны элітарны факультэт для здольных і энергічных абітурыентаў. Наш лозунг: «Мы разумных робім багацейшымі, а багатых – разумнейшымі».



***Аляксандр Казлоў,*** *намеснік начальніка аддзела па наглядзе за аператыўна-вышуковай дзейнасцю і расследаваннем спраў аб карупцыі ўпраўлення Генеральнай пракуратуры па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю, саветнік юстыцыі.*

*– Факультэт даў шмат тэарэтычных ведаў, запатрабаваных на практыцы. Асабліва дапамагла мне сфарміраваць сістэмныя ўяўленні кафедра банкаўскай і фінансавай эканомікі пад кіраўніцтвам доктара эканамічных навук прафесара У.І. Тарасава.*

*Асобна зазначу, што атрыманыя веды сёння запатрабаваныя не толькі ў эканамічнай сферы, але і на стыку эканамічных і юрыдычных ведаў, у тым ліку і ў справе барацьбы з карупцыяй.*

# ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Дэкан — доктар філалагічных навук прафесар Іван Сямёнавіч РОЎДА***
***Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 222-34-21, 222-36-02.***
***E-mail: phyl@bsu.by; www. philology.bsu.by***

Падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў ва ўніверсітэце пачалася ў год яго заснавання: 12 жніўня 1921 г. быў аб'яўлены прыём на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук. Праз год былі створаны педагагічны факультэт з літаратурна-лінгвістычным аддзяленнем у яго структуры. Адкрыццё самастойнага філалагічнага факультэта ў структуры БДУ адбылося ў 1939 г.

У даваенны час на філфаку вучыліся П. Броўка, П. Галавач, П. Глебка, С. Дарожны, А. Звонак, Т. Кляшторны, Кандрат Крапіва. У пасляваенныя гады нашымі студэнтамі былі будучыя народныя пісьменнікі Беларусі І. Мележ, Н. Гілевіч, І. Навуменка, Р. Барадулін, акадэмікі А. Падлужны, А. Жураўскі, члены-карэспандэнты НАН Беларусі А. Булыка, А. Лойка і інш. Некаторыя з іх працавалі на родным для іх факультэце выкладчыкамі.

Сёння на філалагічным факультэце навучаецца больш як 2 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў з Беларусі, а таксама з краін блізкага і далёкага замежжа. Навучальны працэс забяспечваюць 16 кафедраў, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору, лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання, 6 спецыялізаваных кабінетаў: беларускай, украінскай, польскай, кітайскай, італьянскай філалогіі, кабінет аўдыёвізуальных сродкаў навучання, а таксама Цэнтр філалагічных паслуг, які ажыццяўляе падрыхтоўку абітурыентаў да ўступных экзаменаў па беларускай, рускай і замежнай мовах, літаратуры, а таксама арганізуе курсы па вывучэнні замежных моў для студэнтаў універсітэта. На факультэце працуе больш чым 30 дактароў навук і звыш 120 кандыдатаў навук.

Студэнты-філолагі атрымліваюць грунтоўныя веды па беларускай, рускай, сусветнай літаратурах, вывучаюць працэсы гістарычнага развіцця моў, даследуюць іх сучасны стан, а таксама спасцігаюць сакрэты асноў літаратурна-мастацкай дзейнасці, метадаў аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, тэорыі і практыкі перакладу, камп'ютарных тэхналогій. Студэнты славянскай, рамана-германскай, усходняй філалогіі праходзяць моўную практыку ў краінах вывучаемай мовы: Польшчы, Чэхіі, Германіі, Кітаі і інш.

Для студэнтаў і магістрантаў арганізавана каля 80 навуковых спецсемінараў па актуальных праблемах сучаснага літаратуразнаўства і лінгвістыкі, створаны ўмовы для свабоднага карыстання ў навучальных мэтах рэсурсамі інтэрнэт — абсталяваны 3 камп'ютарныя класы на факультэце і 3 міжфакультэцкія медыятэкі.

На вячэрніх курсах студэнты па жаданні вывучаюць дадаткова адну са славянскіх ці заходнееўрапейскіх моў, пасля чаго атрымліваюць адпаведнае пасведчанне. Апрача таго, нашым студэнтам прадстаўляецца магчымасць паралельнага навучання на любым факультэце БДУ для атрымання другой спецыяльнасці: юрыста, эканаміста, псіхолага і інш.



ДЫПЛОМ ФІЛОЛАГА ЗАПАТРАБАВАНЫ!

У наш час, калі актыўна развіваюцца разнастайныя формы міжнароднага супрацоўніцтва, выдатная моўная, агульнакультурная падрыхтоўка дазваляе выпускнікам філалагічнага факультэта БДУ паспяхова працаваць у якасці рэферэнтаў, маркетолагаў, перакладчыкаў у арганізацыях, установах, на прадпрыемствах народнай гаспадаркі любога профілю, у рэкламных агенцтвах і турыстычных фірмах. З укараненнем новых напрамкаў нашы спецыялісты сталі як ніколі запатрабаванымі ў выдавецтвах, у рэдакцыях газет, часопісаў, радыё і тэлебачання. Рознабаковая падрыхтоўка і высокая эрудыцыя дазваляюць ім упэўнена пачуваць сябе ў якасці аўтараў праграм, рэдактараў, а таксама вядучых самых рэйтынгавых перадач. Сёння філолагі паспяхова працуюць у цэнтрах інфармацыйных тэхналогій, у навуковых і навукова-вытворчых цэнтрах, якія займаюцца пытаннямі камп'ютарнай апрацоўкі тэксту і маўлення. Судовыя спрэчкі па абароне аўтарскіх правоў, па абароне годнасці грамадзян невырашальныя без правядзення рознага роду экспертыз тэксту, вусных выказванняў і нават асобных слоў, што, у сваю чаргу, абумовіла неабходнасць прысутнасці філолагаў і ў сістэме праваахоўных органаў. Глыбокая дасведчанасць нашых выпускнікоў у пытаннях сусветнай літаратуры і культуры, выдатная агульнагуманітарная падрыхтоўка забяспечваюць нашым выпускнікам працаўладкаванне ў літаратурных музеях, архівах, аддзелах рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэк, а таксама ў сістэме народнай адукацыі.



***Аксана Волчак,*** *магістрантка (лаўрэат спецфонду прэзідэнта; пераможца Рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове сярод студэнтаў; найлепшая выпускніца філалагічнага факультэта 2010 г.)*

*– Мая жыццёвая сцяжына абрала кірунак на філфак БДУ яшчэ ў дзявятым класе, калі мне пашчасціла трапіць на занятк і па падрыхтоўцы да Рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове. Выкладчыкі, якія праводзілі заняткі, захапілі-зачаравалі мяне. Тады я зразумела, што хачу вучыцца менавіта ў гэтых людзей.*

*Пяць год я радасна спяшалася ў дарагія сэрцу аўдыторыі, дзе заўсёды было пасапраўднаму цікава. Тут, на факультэце, я ніколі не адчувала сябе няўтульна, таму што выкладчыкі падтрымлівалі студэнтаў, дапамагалі паверыць у свае сілы. Тут я зразумела, як можа захапіць навука. Спасціжэнне гістарычных шляхоў развіцця рускай, беларускай, старaславянскай мовы, асэнсаванне таямніц характва і велічы твораў сусветнай літаратуры ад антычнасці да нашых дзён сталіся сэнсам майго студэнцкага жыцця. Родны факультэт дапамог мне стаць кваліфікаваным філолагам, паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы і рыторыцы. І сёння я рада, што аднойчы не памылілася ў выбары.*

# ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

***Дэкан – доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Сцяпан Рыгоравіч МУЛЯРЧЫК***
***Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 209-58-18, 209-58-17.***
***E-mail: mulyarchik@bsu.by; www.rfe.by***

Радыёфізікаў рыхтуюць з 1962 г. У 1976 г. адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі.

Сёння навучальны працэс забяспечваюць больш за 90 выкладчыкаў, у тым ліку 1 акадэмік і 2 члены-карэспандэнты, 15 прафесараў, 63 дацэнты, 49 інжынераў і лабарантаў.

У структуры: 8 кафедраў, 3 навукова-даследчыя лабараторыі, 3 студэнцкія НДЛ, даследчатэхналагічны цэнтр «Нанатэхналогіі і фізічная электроніка», цэнтр аэракасмічнай адукацыі, сучасныя камп'ютарныя класы, медыятэка.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасцях: **«Радыёфізіка»**, **«Фізічная электроніка»**, **«Камп'ютарная бяспека»**, **«Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі»**, **«Прыкладная інфарматыка»**, напрамак («Інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм») з наступнымі спецыялізацыямі: статыстычная радыёфізіка, мультымедыйныя інфармацыйныя тэхналогіі, квантавая радыёфізіка і лазерныя сістэмы, стахастычныя працэсы і сістэмы, мікра- і нанасістэмы, камп'ютарнае прыборабудаванне, інтэлектуальныя інфармацыйныя тэхналогіі, прыкладная электрадынаміка, цвёрдацельная электроніка, нанаэлектроніка і нанатэхналогіі, квантавая электроніка, фізічная мікраэлектроніка, медыцынская электроніка, тэлекамунікацыйныя і інфармацыйныя сістэмы, інфармацыйна-аналітычныя метады ў электроніцы, радыёэлектронныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, комплекснае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі тэлекамунікацыйных і інфармацыйных сістэм, праграмна-тэхнічныя сродкі і сістэмы абароны інфармацыі, інтэлектуальныя тэхналогіі абароны інфармацыйных сістэм, мадэляванне і аналіз інфармацыйных сістэм, глабальныя навігацыйныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, радыёэлектронныя сістэмы апрацоўкі і перадачы інфармацыі, бартавыя і наземныя інфармацыйныя комплексы.



Нашы выпускнікі працуюць у сферах IT, тэлекамунікацый, радыёэлектроннага і аптычнага прыборабудавання, камп'ютарных сетак, праграмаванай электронікі, мікраэлектронікі, нанаэлектронікі, лазерных аптычных тэхналогій. Яны накіроўваюца ў навукова-даследчыя інстытуты, прыборабудаўнічыя, радыёэлектронныя, камп'ютарныя, тэлекамунікацыйныя арганізацыі, фірмы, кампаніі, камп'ютарныя дэпартаменты банкаў. Сярод іх ёсць кіраўнікі і вядучыя спецыялісты навукова-вытворчых аб'яднанняў, даследчых інстытутаў, ВНУ, а таксама буйныя бізнесмены. Сайт Беларускага рэспубліканскага аб'яднання радыёфізікаў – *www.orf.by*.

9 красавіка ў рамках Дзён радыёфізіка адбудзецца вочная алімпіяда па фізіцы (у форме тэсту) «Абітурыент БДУ–2011», пераможцы якой атрымаюць пераважнае права пры залічэнні ў БДУ ў выпадку роўнасці балаў.

Удзел у мерапрыемствах Дзён бясплатны.

***Мікалай Зянькевіч,** выпускнік факультэта РФіЭ 2002 г., старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, галоўны інжынер-праграміст кампаніі-рэзідэнта ПВТ «ЭПАМ Сістэмз».*



*– З фізікі вядома што, калі частата ўласных хістанняў супадае з частатой знешнега ўздзеяння, то ўзнікае рэзананс і ўздзеянне можа быць шматразова ўзмоцнена. Нешта падобнае, як мне здаецца, адбываецца і на нашым факультэце. Цікаўнасць і энергія студэнтаў узмацняецца энтузіязмам і вопытам выкладчыкаў – яны падладжваюцца, прыціраюцца адзін да аднага, а затым пачынаюць працаваць на поўную моц. Такі сплаў дазваляе студэнтам атрымаць агульны фундаментальны базіс вышэйшай тэхнічнай адукацыі, а таксама практычныя навыкі, запатрабаваныя як у Беларусі, так і за мяжой, а выкладчыкі змушаны працягваць самаадукацыю і развівацца разам са сваімі вучнямі. Я магу гэта сцвярджаць, бо быў і студэнтам факультэта, тады яшчэ радыёфізікі і электронікі, так і выкладчыкам цяпер ужо радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.*



***Дзмітрый Шчагрыковіч,** студэнт 5 курса ФРКТ, малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі лазернай плазмадынамікі НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі.*

*– Высокі ўзровень адукацыі і вялізны навуковы патэнцыял выкладчыкаў ФРКТ дазваляе выпускнікам атрымліваць якасную адукацыю, і станавіцца запатрабаванымі спецыялістамі і навукоўцамі. За апошні год я стаў пераможцам дзвюх міжнародных і адной усерасійскай канферэнцыі маладых вучоных. Добразычлівая атмасфера, сяброўскае атачэнне, сучасная навукова-тэхнічная база факультэта дазваляе ўвасабляць у жыццё самыя смелыя праекты і ідэі.*

# ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ

***Начальнік – палкоўнік Мікалай Паўлавіч БАДЗЮК***
***Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4. Тэл. 209-56-46.***
***Тэл./факс 209-56-46, 209-56-25***

Факультэт пачынаўся з ваеннай кафедры БДУ, утворанай 4 лістапада 1926 г. За перыяд да 2003 г. ваенная кафедра падрыхтавала тысячы афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях.

У 2003 г. кафедра была рэарганізаваная ў ваенны факультэт БДУ.

Падрыхтоўка студэнтаў па праграмах афіцэраў запасу вядзецца па 9 спецыяльнасцях, па праграмах малодшых вайсковых спецыялістаў – па 15.

Падчас навучання курсанты і студэнты выконваюць практыкаванні стральбы са стралкової зброі, сродкаў узбраення БМП, а таксама практыкаванні па кіраванні баявой тэхнікай.

Падрыхтоўка курсантаў на ваенным факультэце вядзецца па 6 спецыяльнасцях: «Псіхалогія» (спецыялізацыя – «Маральна-псіхалагічнае забеспячэнне вайсковай дзейнасці»), «Хімія» (напрамак – радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона), «Журналістыка» (напрамак – друкаваныя СМІ, спецыялізацыя – «Ваенная журналістыка»), «Правазнаўства» (спецыялізацыя – «Юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы»), «Міжнародныя адносіны» (спецыялізацыя – «Міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы»), «Геаграфія» (напрамак – геаінфармацыйныя сістэмы, спецыялізацыя – «ГІС ваеннага прызначэння»).



**Псіхалогія**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *«Псіхолаг, выкладчык псіхалогіі»*. Ён павінен быць падрыхтаваны да арганізацыйна-кіраўніцкай і выкладчыцкай дзейнасці ў галіне арганізацыі і праводзення псіхалагічнай работы ў падраздзяленні. Выпускнік можа заняць першасную афіцэрскую пасаду псіхолага батальёна.

**Хімія**: пасля заканчэння навучання надаецца кваліфікацыя *«Спецыяліст па кіраванні. Хімік-эколаг»*. Выпускнік прызначаны для праходжання службы ў падраздзяленнях і часцях радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны з першай пасадай камандзіра ўзвода, а таксама для працы ў структурах народнай гаспадаркі ў галіне радыяцыйнай бяспекі і экалогіі.

**Журналістыка**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *«Журналіст»*. Ён прызначаны для праходжання вайсковай службы на першаснай афіцэрскай пасадзе карэспандэнта (аглядальніка) у рэдакцыях вайсковых сродкаў масавай інфармацыі, афіцэра інфармацыйнага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

**Правазнаўства**: выпускніку надаецца кваліфікацыя *«Юрыст»*. Яго рыхтуюць да арганізацыйна-кіраўнічай, навукова-даследчай, экспертна-аналітычнай дзейнасці.

**Міжнародныя адносіны**: кваліфікацыя выпускніка *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў)»*. Выпускнік павінен быць падрыхтаваны для замяшчэння першасных афіцэрскіх пасад у структурных падраздзяленнях Міністэрства абароны Беларусі і Генеральнага штаба Узброеных Сіл, якія адказваюць за планаванне, арганізацыю і праводзенне мерапрыемстваў міжнароднага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы, а таксама верыфікацыйнай дзейнасці.

**Геаграфія**: выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *«Географ. Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах»*. Ён прызначаны для праходжання вайсковай службы ў навігацыйна-тапаграфічных часцях і падраздзяленнях на першаснай вайсковай пасадзе картографа.



***Сяргей Карповіч,** лаўрэат спартакіяды БДУ ў намінацыі «Найлепшы спартсмен (неалімпійскі від спорту)».*

*– З самага дзяцінства марыў стаць самастойным чалавекам і дамагчыся поспеху ў жыцці. Я тады ўбачыў, што гэтага можна дасягнуць у арміі, і цвёрда вырашыў паступіць у сувораўскае вучылішча. Мяне зацікавіла перспектыўная спецыяльнасць – «Геаінфармацыйныя сістэмы ў ваеннай сферы». Ваенны факультэт дае магчымасць стаць высокакваліфікаваным спецыялістам. Акрамя таго, тут створаны добрыя ўмовы для рэалізацыі маіх спартыўных амбіцый, бо з маладых гадоў займаюся цяжкай атлетыкай. Дарэчы, на ваенным факультэце заняткі спортам усяляк заахвочваюцца. Тым больш гіравы спорт, якім я займаюся, уключаны ў праграму рэспубліканскай універсіяды, а таксама з'яўляецца ваенна-прыкладным відам спорту. Дзякуючы падтрымцы камандавання факультэта і трэнераў, я за год выканаў нарматыў майстра спорту, затым стаў чэмпіёнам Узброеных Сіл і Рэспублікі Беларусь, прызёрам чэмпіянату свету і Еўропы, а ў красавіку 2010 года – чэмпіёнам свету сярод юніёраў.*

# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – кандыдат гістарычных навук дацэнт Сяргей Мікалаевіч ХОДЗІН*
*Адрас: г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6. Тэл. 209-55-98, 227-71-00.*
*E-mail: hist@bsu.by; www.hist.bsu.by*

Гістарычны факультэт БДУ – найстарэйшая і найбольш аўтарытэтная навучальная і навуковая ўстанова гістарычнага профілю ў краіне.

Тут у кастрычніку-лістападзе 1921 г. адбылося адкрыццё ўніверсітэта. З тых часоў бярuць пачатак навуковыя гістарычныя школы на факультэце, якія дагэтуль шырока вядомыя ў рэспубліцы і па-за яе межамі. Гістфак ганарыцца сваімі 10 тыс. выпускнікоў, якія працуюць у сістэме навукі і адукацыі, мас-медыя, музеях, турыстычных фірмах, банкаўскіх установах, удзельнічаюць у палітычным жыцці краіны, яе адміністрацыйным кіраванні.

На факультэце працуюць 1 акадэмік, 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, больш за 20 прафесараў і 75 дацэнтаў – вядучых спецыялістаў у сваёй галіне.

Дзейнічаюць 9 кафедраў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па чатырох спецыяльнасцях:

1. **«Гісторыя»**, па напрамках: айчынная і ўсеагульная гісторыя, паліталогія, археалогія, этналогія, гісторыя мастацтваў, гісторыя рэлігій;

2. **«Гісторыка-архівазнаўства»**;

3. **«Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»**, па напрамках: «гісторыя і музеялогія», «мастацтвазнаўства і музеялогія», «культурная спадчына і турызм»;

4. **«Дакументазнаўства»** па напрамках: «Дакументацыйнае забеспячэнне кіравання», «Інфармацыйнае забеспячэння кіравання», «Абарона інфармацыі».

Напрамак спецыяльнасці студэнты выбіраюць на падставе свайго рэйтынгу паспяховасці па заканчэнні 4-х семестраў.



Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыя» уладкоўваюцца ў школах і гімназіях, а таксама ва ўстановах вышэйшай адукацыі і навукі, дзяржаўных установах, мас-медыя і г.д. Новыя накірункі – паліталогія, археалогія, гісторыя рэлігій – робяць вывучэнне гістарычных праблем больш разнастайным і набываюць усё большую папулярнасць сярод абітурыентаў.

Музеязнаўцы падчас навучання праходзяць практыку ў найбольш славутых музеях краіны, ва ўстановах адукацыі, турыстычных фірмах. Зараз факультэт узяў курс на хуткае развіццё напрамку спецыяльнасці «культурная спадчына і турызм», каб забяспечыць патрэбы дзяржавы ў высокапрафесійных спецыялістах у галіне рэгіянальнага турызму.

Архівісты і дакументазнаўцы рыхтуюцца пры ўдзеле дэпартамента Міністэрства юстыцыі, куды пераважна і размяркоўваюцца. Акрамя таго, дакументазнаўцы працуюць у банкаўскіх установах, кадравых службах, службах ДЗК.

На спецыяльнасці «Дакументазнаўства» студэнтам выкладаецца шырокае кола прававых дысцыплін, для чаго прыцягваюцца выкладчыкі юрыдычнага факультэта БДУ і юрысты-практыкі.

Ва ўмовах сучаснай універсітэцкай адукацыі традыцыі факультэта спалучаюцца з выкарыстаннем навацый. Тут дзейнічаюць 3 камп'ютарныя класы з выхадам у інтэрнэт. Падчас лекцый шырока выкарыстоўваецца мультымедыйная тэхніка. Студэнты вывучаюць шырокі блок дысцыплін, звязаных з інфармацыйнымі тэхналогіямі.

Актывізацыі навучальнага працэсу спрые музей археалогіі, этнаграфіі і антычнага мастацтва. Яго нумізматычная калекцыя – адна з самых багатых і каштоўных у краіне.



***Ксенія Абрамава,*** *галоўны спецыяліст Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спецыяльнасць «гісторыя». Выпускніца 2007 г.*

*– Мне здаецца, што гістарычны факультэт з'яўляецца асаблівым падраздзяленнем БДУ. Яго ўнікальнасць вызначаецца некалькімі простымі, але вельмі важнымі абставінамі. Тут можна атрымаць выдатную фундаментальнае адукацыю. Тут вучаць думаць шырока і крытычна, бачыць стратэгічную перспектыву, усталёўваць прычынна-выніковыя сувязі, выяўляць заканамернасці развіцця. Добра навучаюць замежным мовам, што асабліва каштоўна і неабходна ў сучасным свеце. Факультэт прымае ўдзел у розных еўрапейскіх праграмах. Адукацыйны працэс пабудаваны на перадавых інфармацыйных тэхналогіях. Гістфак дае велізарную колькасць магчымасцяў для самарэалізацыі. Спартыўныя каманды, арганізацыі студэнцкага самакіравання, розныя фарматы сацыяльнай і грамадскай актыўнасці, даследчыя клубы. Студэнцкая актыўнасць, накіраваная на рэалізацыю неардынарных і значных праектаў, заўсёды падтрымліваецца кіраўніцтвам факультэта.*



***Яўген Мальчэўскі,*** *галоўны спецыяліст аддзела кантролю і справаводства Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, спецыяльнасць «дакументазнаўства». Выпускнік 2009 г.*

*– Гістфак – гэта асобны свет, які мае грунтоўныя традыцыі ў арганізацыі навучальнага працэсу. Але як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў факультэт не толькі вучоба, але і навуковая дзейнасць, і міжнароднае супрацоўніцтва з замежнымі ВНУ, і грамадскае жыццё, і новыя знаёмствы.*

*Адно з галоўных, што я атрымаў з вучобы на гістфаку, – гэта неацэнны досвед зносін з таленавітымі выкладчыкамі, навукоўцамі, дзякуючы якім я адчуваю сябе прафесіяналам сваёй справы.*

*Актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці факультэта дазволіў мне набыць так неабходныя кожнаму чалавеку ў жыцці навыкі – камунікабельнасць, дыпламатычнасць, уменне ісці на кампраміс, працаваць у камандзе, браць на сябе адказнасць.*

*Скончыўшы гістарычны факультэт, я адчуў усю каштоўнасць атрыманай мною гуманітарнай адукацыі высокага ўзроўню, якая дае мне магчымасць глыбока разумець сваю дзейнасць.*

# ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

*Дырэктар – кандыдат філалагічных навук дацэнт Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9.*
*Тэл. 259-74-00.*
*E-mail: jour@bsu.by; www.journ.bsu.by*

Факультэт журналістыкі БДУ быў заснаваны ў 1944 г. і стаў першым факультэтам такога кшталту ў былым СССР.

Зараз тут працуюць 8 прафесараў, 10 дактароў навук, 53 дацэнты, 56 кандыдатаў навук.

У інстытуце на факультэце журналістыкі дзейнічае 9 кафедраў.

Агульная колькасць студэнтаў – 1564 чалавекі, магістрантаў – 10, аспірантаў – 17.

За апошнія гады факультэт журналістыкі поўнасцю абнавіў вучэбныя планы, мадэрнізаваў навучальна-тэхнічную базу. Створана Эксперыментальнае моладзевае творчае тэлерадыёаб'яднанне (ЭМТТРА), функцыянуе вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій. Практычныя заняткі па шэрагу дысцыплін праходзяць на базе Тэлецэнтра БДУ.

У навучальным працэсе шырока выкарыстоўваюцца сучасныя інавацыйныя метады. Выкладчыкамі па кожнай дысцыпліне падрыхтаваны вучэбна-метадычныя комплексы, манаграфіі. З 2008 г. навучанне вядзецца згодна з новымі адукацыйнымі стандартамі.

У рэдакцыях вядучых дзяржаўных друкаваных СМІ, тэлеканалаў і радыёстанцый, прэсслужбах і службах па сувязях з грамадскасцю, прэс-цэнтрах, інфармацыйных і рэкламных агенцтвах, выдавецтвах створаны філіялы факультэцкіх кафедраў – творчыя лабараторыі журналісцкага майстэрства. Майстар-класы са студэнтамі праводзяць вядомыя журналісты нашай краіны. Студэнты выдаюць вучэбныя газеты «ЖУРфакты» і «Перья».



Упершыню на прасторах СНД менавіта ў БДУ пачалася падрыхтоўка спецыялістаў для інтэрнэт-рэдакцый друкаваных і аўдыявізуальных СМІ, анлайнавых выданняў. Выпускнікі напрамку «Вэб-журналістыка» змогуць працаваць карэспандэнтамі, аглядальнікамі, рэдактарамі сайтаў, рэдактарамі інтэрактыўнага вяшчання.

Прапануем наступныя спецыяльнасці і спецыялізацыі:

**Журналістыка** (кваліфікацыя *«Журналіст»*).

Напрамак: друкаваныя СМІ. Спецыялізацыя: «Перыядычны друк».

Напрамак: аўдыявізуальная журналістыка. Спецыялізацыі: «Тэлежурналістыка», «Радыёжурналістыка».

Напрамак: вэб-журналістыка.

Напрамак: менеджмент сродкаў масавай інфармацыі.

**Журналістыка міжнародная** (кваліфікацыя *«Журналіст-міжнароднік»*).

Спецыялізацыі: «Міжнародная журналістыка і палітыка», «Міжнародная журналістыка і эканоміка».

**Інфармацыя і камунікацыя** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі. Журналіст»*).

Напрамак: тэхналогіі камунікацыі. Спецыялізацыя: «Рэкламная інфармацыя і камунікацыя».

**Літаратурная работа**

Напрамак: рэдагаванне (кваліфікацыя *«Літаратурны рэдактар. Журналіст»*). Спецыялізацыі: «Літаратурнае рэдагаванне ў СМІ», «Літаратурнае рэдагаванне ў выдавецтвах».

Напрамак: творчасць (кваліфікацыя *«Літаратурны работнік»*).

Попыт на журналісцкія кадры ў краіне сёння застаецца вельмі высокім.

З 1 верасня 2008 г. факультэт журналістыкі быў рэарганізаваны ў Інстытут журналістыкі з двума факультэтамі – факультэтам журналістыкі і факультэтам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Пры факультэце журналістыкі Інстытута журналістыкі працуюць падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў.

Шчыра запрашаем!




***Мікалай Казловіч,*** *спецыяльны карэспандэнт аддзела журналісцкіх расследаванняў газеты «СБ. Беларусь Сёння», уладальнік «Залатой літары–2010» як найлепшы рэпарцёр. Выпускнік факультэта журналістыкі 2006 г.*

*– Самае галоўнае для журналіста – зарабіць сябе імя. Справа гэта клапотная. Таму, чым раней пачнуцца «заробкі», тым лепш. Вольная аўра, якая панавала тады яшчэ на факультэце журналістыкі, дазваляла нам з галавой акунуцца ў творчасць. Мы былі гатовыя ўгрызацца зубамі ў кожнага журналіста-практыка, які прыходзіў на заняткі з майстар-класам. З радасцю выпускалі навучальныя газеты, прымяраючы на сябе ролю карэспандэнтаў, карэктараў, стыль-рэдактараў, вярстальшчыкаў. Як высветлілася потым, усе гэтыя веды спатрэбіліся. І няхай у рэдакцыях нас чакала пэўнае расчараванне, няхай мы зразумелі, што журналістыка – гэта, хутчэй, не вольны палёт, а цяжкая праца на галеры, дзе ў кожнага сваё вясло, той першы вопыт прафесійнага самавыяўлення я лічу неацэнным.*

# ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ БДУ

*Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук*
*прафесар Уладзімір Уладзіміравіч АПАНАСОВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4. Тэл./факс 210-41-06.*
*E-mail: sbmt@bsu.by; www.sbmt.by*

ІБМТ БДУ ўтвораны ў 1996 г. Асноўнай задачай інстытута з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў міжнароднага ўзроўню ў галіне бізнес-кіравання і кіравання новымі тэхналогіямі.

У 2004 г. інстытут упершыню ў Беларусі пачаў падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне». З 2009 г. адкрыта спецыяльнасць «Лагістыка» і «Кіраванне інавацыйнымі працэсамі». Спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» і «Лагістыка» прапануюць атрыманне першай і другой вышэйшай адукацыі ў дзённай і завочнай формах, а спецыяльнасць «Кіраванне інавацыйнымі працэсамі» прапануе атрыманне толькі другой вышэйшай адукацыі ў завочнай форме.

Гэтыя спецыяльнасці сёння з'яўляюцца аднымі з найбольш запатрабаваных у эканоміцы. Яны прадугледжваюць аваломданне выпускніком ведамі, навыкамі, а таксама светапоглядам, які грунтуецца на глыбокім разуменні рынкавай эканомікі і яе магчымасцяў, функцый і эканамічнай ролі дзяржавы, усведамленні сацыяльнай адказнасці бізнесу і прыхільнасці да цывілізаваных этычных нормаў яго вядзення. Праграмы падрыхтоўкі разлічаны на тых, хто плануе ў будучым прэтэндаваць на кіраўнічыя пасады ў бізнесе.

Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца вывучэнню англійскай мовы, якая з'яўляецца не толькі праграмнай дысцыплінай, але і моваю выкладання асобных курсаў. Большасць выкладчыкаў прайшла спецыяльную падрыхтоўку ці стажыроўку за мяжой у рамках сумесных міжнародных адукацыйных праектаў.

З 1996 г. у нас рэалізуецца магістарская праграма па падрыхтоўцы бізнес-спецыялістаў найвышэйшай кваліфікацыі. У 2003 г. выпускнікі гэтай праграмы ўпершыню ў Беларусі атрымалі дзяржаўны дыплом магістра па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне». Паводле ацэнкі членаў міжнароднай экзаменацыйнай камісіі, узровень ведаў нашых выпускнікоў адпавядае стандартам якасці заходніх універсітэтаў.

Адна з асноўных асаблівасцяў інстытута – паслядоўнае далучэнне да міжнароднай адукацыйнай прасторы. ІБМТ мае партнёрскія зносіны з многімі заходнімі ўніверсітэтамі, актыўна ўдзельнічае ў разнастайных міжнародных праектах. У рамках адукацыйных праграм, якія дзейнічаюць у інстытуце, найлепшыя студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у праграме абмену са Школай менеджменту і эканомікі ўніверсітэта Векша (Швецыя), універсітэтам Молдэ (Нарвегія).

Вольны доступ да інтэрнэту ў камп'ютарных класах інстытута дазваляе студэнтам эфектыўна выкарыстоўваць рэсурсы глабальнай сеткі пры падрыхтоўцы да заняткаў. Актыўна развіваецца сістэма дыстанцыйнага навучання.

Запрашаем стаць студэнтамі Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ!



***Кацярына Дудзіч,*** *спецыяліст па маркетынгу прадстаўніцтва буйной замежнай кампаніі ў Беларусі. Выпускніца 2010 г.*



*– Сёння магу ўжо ўпэўнена сказаць: я абсалютна не шкадую, што прыйшла вучыцца ў ІБМТ. Я доўга выбірала ВНУ, бо ў мяне як у пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па нямецкай мове была магчымасць выбару. Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій даў мне шмат – веды, упэўненасць у сваіх сілах, накіраванасць, лідарскі дух, і, нарэшце, сяброў. Астатняе залежыць толькі ад мяне.*

*Падчас вучобы мне пашчасціла выйсці ў фінал «Еўрафэсту» – гэта адбылося, у тым ліку, дзякуючы падтрымцы альма-матар.*

*Я задаволеная тым, як складаецца мая кар'ера зараз, і бачу перспектыву.*



***Аляксей Гіско,*** *крэдытны эксперт аддзела па рабоце з малым бізнесам ЗАТ «Банк ВТБ (Беларусь)». Выпускнік 2009 г.*

*– У ІБМТ эфектыўная адукацыйная праграма, высакакласны склад выкладчыкаў, зацікаўленыя студэнты – адно цэлае.*

*Для мяне было вельмі важна, што інстытут робіць усё магчымае, каб даць студэнтам якасную адукацыю. Еўрапейская сістэма камунікацый (мабільнасць выкладчыкаў, аператыўнае прыняцце і выкананне рашэнняў) стварае спрыяльную атмасферу для вучобы. Вытворчую і пераддыпломную практыку мы праходзілі ў буйных, вядомых арганізацыях: «Белнафтахіме», IBA, «Беларусьфільме», будаўнічых арганізацыях, банкаўскіх установах, кансалтынгавых агенцтвах, страхавых кампаніях. Студэнтам даецца магчымасць не толькі выкарыстаць на практыцы атрыманыя веды і навыкі, але і «зарабіць» аўтарытэт у будучых патэнцыйных працадаўцаў.*

# ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

*Дырэктар – доктар гістарычных навук, прафесар,*
*заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь*
*Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН*
*Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7. Тэл. 306-00-20,*
*факс 306-00-40. E-mail: mail@e-edu.by; www.e-edu.by*

Дзейсныя эканамічныя пераўтварэнні немагчымы без кваліфікаваных спецыялістаў, якія б мелі фундаментальныя веды ў галіне эканомікі, кіравання, права, сацыяльных навук, валодалі б сучаснымі тэхналогіямі, маглі б без цяжкасцяў працаваць на сусветным узроўні. Аснова эфектыўнасці навучання ў інстытуце – якасць і ўзровень выкладання, навізна навучальных праграм, склад выкладчыцкіх кадраў.

Спецыяльнасць: **Менеджмент**

Напрамкі спецыяльнасці:

менеджмент (сацыяльна-адміністратыўны), спецыялізацыя: кіраванне персаналам;

менеджмент (фінансавы і інвестыцыйны), спецыялізацыя: фінансавы менеджмент;

менеджмент (нерухомай маёмасці).

Гэтая спецыяльнасць дазваляе атрымаць адну з найбольш цікавых прафесій – *менеджар-эканаміст*. Па ёй рыхтуюцца спецыялісты шырокага профілю з рознабаковай эканамічнай і прававой падрыхтоўкай. Студэнты набываюць навыкі аналізу механізму кіравання прадпрыемствам, авалодваюць тэхналогіяй і метадамі працы з людзьмі.

Спецыяльнасць: **Сацыяльная работа**

Напрамак спецыяльнасці: сацыя-медыка-псіхалагічная дзейнасць;

кваліфікацыя: *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце. Псіхолаг».*

Сацыяльная работа – перспектыўная новая спецыяльнасць. Такія спецыялісты патрэбны для вырашэння шматлікіх сацыяльных, сацыяльна-псіхалагічных праблем усіх катэгорый насельніцтва. Студэнты атрымліваюць грунтоўныя веды па псіхалогіі, сацыяльнай медыцыне, тэорыі і практыцы сацыяльнай работы, рэабілітalогіі. Наяўнасць у вучэбным плане прававых дысцыплін і дысцыплін менеджменту дазваляе выпускнікам не толькі працаваць у дзяржаўных структурах (сацабарона, ахова здароўя, праца, прадпрыемствы, навучальныя ўстановы і г.д.) і грамадскіх арганізацыях (міжнародныя і рэспубліканскія фонды, асацыяцыі, таварыствы), але і самастойна развіваць бізнес у сферы сацыяльных паслуг.

Спецыяльнасць: **Дызайн**

Напрамак спецыяльнасці: дызайн (прадметна-прасторавага асяроддзя); кваліфікацыя: *«Дызайнер».*

Адметным у падрыхтоўцы спецыялістаў з'яўляецца спалучэнне прафесійнага трэнінгу ў галіне праектавання, кампазіцыі, жывапісу і малюнка, пластыкі, фармаўтварэння з выкарыстаннем найноўшых інфармацыйных і матэматычных тэхналогій мадэлявання асяроддзя, з культурнымі, экалагічнымі фактарамі прафесіі. ДІКСТ забяспечвае падрыхтоўку дызайнераў па тэорыі і гісторыі мастацтваў і дызайне, сучасных стратэгіях фармаўтварэння і праектавання, камп'ютарных тэхналогіях, замежных мовах.

Спецыяльнасць: **Правазнаўства**

Спецыялізацыя: прававое забеспячэнне бізнесу; кваліфікацыя: *«Юрыст».*

Студэнты гэтай спецыяльнасці вывучаюць як юрыдычныя, так і эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя, грамадска-гуманітарныя, кіраўніцкія дысцыпліны. Будучым юрыстам прапануюцца курсы бухгалтарскага ўліку, аналізу гаспадарчай дзейнасці, макра- і мікраэканомікі, тэорыі і практыкі кіравання, псіхалогіі.





***Тацццяна Кобзева,*** *начальнік аддзела па кіраванні персаналам «ПарфюмБытХім». Выпускніца 2005 г.*

*– Вызначальны для мяне той багаж ведаў і навыкаў, які я набыла падчас вучобы. У выніку даводзіцца прымяняць веды з усіх сфер: і базавую псіхалагічную адукацыю, і веды ў галіне фінансаў, лагістыкі, маркетынгу – усё, як выявілася, патрэбнае. І гэта, дарэчы, адна з цяжкасцяў у прафесіі HR-менеджара.*

*Добрая адукацыя і аналітычныя здольнасці вельмі дапамагаюць. І, вядома, тыя амбіцыі, якія мной рухаюць.*

*Скончыўшы вучобу ў інстытуце з адзнакай, упершыню атрымала магчымасць адаць пачуццё вялізнага задавальнення ад асабістых дасягненняў, звязаных з прафесійным ростам. Інстытут трансфармуе сціплага ва ўпартую, настойлівую асобу, вучыць планаваць час і працаваць на вынік.*

*Інстытут выпрацаваў ува мне тры жыццёвыя прынцыпы: самадысцыпліна, самаўдасканаленне і штодзённая праца.*

*Менавіта ў ДІКСТ я навучылася дамагацца пастаўленых мэт. Мая парада: інвесціруйце ў сябе ўжо зараз!*

# ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ БДУ

*Рэктар – Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ФІЛАРЭТ,*
*Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, доктар багаслоўя, прафесар*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24*
*Тэл. 289-11-61, 227-63-67, 220-23-55; факс 289-11-61.*
*E-mail: institut-teologii@tut.by; www.inst.by*

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ ажыццяўляе падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Тэалогія»** з прысваеннем кваліфікацыі *«Тэолаг-рэлігіявед. Выкладчык этыкі, эстэтыкі і культуралогіі»*. Нашы выпускнікі маюць магчымасць альбо працягваць навучанне ў магістратуры і аспірантуры, альбо працаваць выкладчыкамі курса «Рэлігіязнаўства» і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у ВНУ і ССНУ. Высокі ўзровень падрыхтоўкі дазваляе ім таксама паспяхова працаваць у сферы навукі, культуры, царкоўнага і сацыяльнага служэння.



У структуры інстытута тры кафедры: філасофска-хрысціянскай антрапалогіі, біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння, рэлігіязнаўства. Дзейнічаюць вучэбная літургічная і навукова-даследчая лабараторыі. Больш за 50 % выкладчыкаў інстытута маюць навуковыя ступені і званні.

Студэнты вывучаюць 6 замежных моў: чатыры старажытныя (старажытнаяўрэйскую, старажытнагрэчаскую, лацінскую, царкоўнаславянскую) і дзве сучасныя (на выбар).

У цыкле спецыяльных дысцыплін вывучаюцца Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запаветаў, біблейская археалогія, багаслоўе (асноўнае, параўнальнае, дагматычнае, маральнае), літургіка, патралогія, агульная гісторыя хрысціянскай Царквы, кананічнае права, гістарычнае рэлігіязнаўства, сектазнаўства, сістэматычнае рэлігіязнаўства, рэлігійная філасофія, візанталогія, псіхалогія рэлігіі, сацыялогія рэлігіі.

Сёння ў бібліятэцы інстытута назапашаны ўнікальны фонд навуковай літаратуры па багаслоўскіх, царкоўна-гістарычных, рэлігіязнаўчых і рэлігійна-філасофскіх дысцыплінах. Бібліятэчны фонд і фонд электронных рэсурсаў уключае 9900 назваў (16 034 адзінкі захавання).



***Міхаіл Міроненка,*** *найлепшы студэнт БДУ 2005 г., лаўрэат гарадскога конкурсу «Найлепшы сацыяльны праект сярод моладзі» 2006 г. Найлепшы выпускнік БДУ 2008 г.*

*Месца працы: Выдавецтва Беларускага Экзархата.*

*– Вучоба ў Інстытуце тэалогіі пакінула самыя светлыя ўспаміны. Тут я трапіў у рукі выдатных выкладчыкаў, якія дапамаглі раскрыць мой патэнцыял.*

*Заўсёды студэнту, будучаму педагогу, у першыя часы не хапае практыкі. З 1 па 5 курс я меў унікальную магчымасць выкладаць у дзейнай нядзельнай школе пры інстытуце, а таксама вёў тэатр-студыю «Божая кароўка»! Гэта бясцэнны вопыт. Акрамя таго, удзельнічаў у многіх сацыяльных акцыях. Пабываў у Еўропе, дзе атрымаў досвед зносін з багасловамі многіх краін.*

*Мае сябры і калегі працуюць як у царкоўнай, так і ў свецкай сферах. Гэта іярэі, дыяканы, навукоўцы, выкладчыкі, журналісты, супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі, перакладчыкі.*



***Станіслаў Паўлаў,*** *студэнт 5 курса Інстытута тэалогіі БДУ і факультэта тэалогіі Берлінскага універсітэта ім. Гумбальдта, уладальнік імяннай стыпендыі імя прап. Еўфрасінні Полацкай.*

*– Тэалогія – гэта класічная вучэбная дысцыпліна, якая стаіць ля вытокаў усёй універсітэцкай адукацыі.*

*Інстытут тэалогіі прапануе сваім студэнтам выдатную гуманітарную адукацыю, а валоданне мовамі, як сучаснымі, так і старажытнымі, з'яўляецца неабходным інструментам у сур'ёзнай навуковай рабоце.*

*Аднак жыццё чалавека не абмяжоўваецца толькі інтэлектуальнай сферай. Студэнты-тэолагі часта ініцыіруюць розныя моладзевыя праекты сацыяльнай, экалагічнай і творчай скіраванасці, для чаго ў інстытуце створаны ўсе ўмовы.*

*Гэта, без сумнення, унікальная навучальная ўстанова валодае ўсімі якасцямі для таго, каб стаць alma mater для выдатных спецыялістаў, якія сумяшчаюць прафесіяналізм і актыўную жыццёвую пазіцыю.*

# ФАКУЛЬТЭТ ДАУНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ

*Дэкан факультэта – Вячаслаў Міхайлавіч МАЛАФЕЕЎ*
*г. Мінск, вул. Маскоўская,15, тэл. 209-59-59.*
*E-mail: fpuedu@bsu.by; www. fpuedu.bsu.by*

Колькасць выкладчыкаў – 60, у тым ліку 7 дацэнтаў, 41 старшы выкладчык. Таксама прыцягваюцца вопытныя выкладчыкі як базавых кафедраў БДУ, так і ліцэяў і гімназій г. Мінска.

Маецца значны аўдыторны фонд (700 м²), чатыры мультымедыйныя камп'ютарныя класы, бібліятэка з вялікім фондам літаратуры для абітурыентаў (каля 18 тыс. тамоў).

**Падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян** функцыянуе ў БДУ з 1969 г. Вучэбны працэс забяспечвае кафедра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. Асноўная мэта – падрыхтоўка слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання і паспяховай здачы ўступных іспытаў на ўсе спецыяльнасці БДУ і на адпаведныя спецыяльнасці іншых ВНУ. На факультэце вядзецца падрыхтоўка па 16 профілях навучання: фізічны, матэматычны, хімічны, геаграфічны, біялагічны, гістарычны, правазнаўства, эканамічны, мовазнаўства, літаратуразнаўства, філасофскі, сацыялагічны, культуралагічны, замежныя мовы, журналістыка, псіхалогія, сацыяльная абарона, міжнародныя адносіны, культура і мастацтва.

Вучэбны план кожнага профілю ўключае тыя дысцыпліны, па якіх прадугледжаны ўступныя выпрабаванні ў ВНУ. Форма навучання – дзённая. Тэрмін навучання на падрыхтоўчым аддзяленні складае 9 месяцаў з тыднёвай нагрузкай 30 акадэмічных гадзін, агульны аб'ём акадэмічных гадзін складае 960.

Рабочыя праграмы ўсіх дысцыплін складзены з улікам паглыблення, сістэматызацыі і абагульнення ведаў, атрыманых вучнямі ў сярэдняй школе. Навучальны год складаецца з двух семестраў, якія завяршаюцца экзаменацыйнымісесіямі,заняткі праводзяцца ў форме практычных і семінарскіх заняткаў, шырока выкарыстоўваюцца розныя формы кантролю самастойнай работы. Такім чынам, слухачы атрымліваюць магчымасць адаптавацца да ўніверсітэцкай сістэмы адукацыі. Аб эфектыўнасці дзейнасці падрыхтоўчага аддзялення сведчыць той факт, што ўзровень паспяховасці выпускнікоў аддзялення на першым курсе ВНУ перавышае 90%.

Для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне патрэбны наступныя дакументы: заява на імя рэктара, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), сертыфікаты ЦТ, 2 фотаздымкі 3х4, медыцынская даведка формы № 086-У. Калі ў абітурыента няма сертыфіката ЦТ па профільным прадмеце, то па ім праводзіцца ўступны іспыт у форме тэсціравання.

Навучанне на аддзяленні платнае, але юнакі і дзяўчаты з сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва, а таксама пацярпеўшыя ад аварыі на ЧАЭС навучаюцца без аплаты.

Тэл.: 200-79-64, 209-59-59.

**Падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян** вядзе сваю гісторыю з 1961 г. За гэты час тут навучалася каля 7 тыс. асоб больш чым з 90 краін. Вучэбны працэс на аддзяленні забяспечвае кафедра рускай мовы як замежнай і агульнаадукацыйных дысцыплін. З 2009 г. на аддзяленні вядзецца падрыхтоўка па двух вучэбных планах: для грамадзян СНД і далёкага замежжа. У структуры вучэбнага плана ў аб'ёме 1200 акадэмічных гадзін: руская мова (60–75% гадзін) і два профільныя прадметы.

Форма навучання – дзённая, навучанне платнае. Па выніках станоўча здадзеных экзаменаў за падрыхтоўчы курс замежныя грамадзяне атрымліваюць пасведчанне, якое дае ім права быць залічанымі для навучання па выбранай спецыяльнасці як у БДУ, так і ў іншыя ВНУ Рэспублікі Беларусь.





Пры падрыхтоўчым аддзяленні працуюць таксама **курсы рускай мовы для замежных спецыялістаў**, на якіх даецца магчымасць вывучаць рускую мову па розных праграмах з аб'ёмам гадзін ад 80 да 720. У ліпені–верасні дзейнічае летняя школа рускай мовы.

Для паступлення замежным грамадзянам трэба падаць наступныя дакументы: запрашэнне на навучанне, заяву на імя рэктара, пашпарт з візай, дакумент аб адукацыі, медыцынскую страхоўку і 6 фотаздымкаў.

Тэл.: 209-59-58, 209-59-59.

На працягу навучальнага года для абітурыентаў дзейнічаюць розныя па формах (вячэрнія, завочныя, вочна-завочныя) і тэрмінах навучання (ад 4 да 9 месяцаў) **падрыхтоўчыя курсы**. Заняткі праводзяцца па 4 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень на прадмет у залежнасці ад формы навучання і камплектнасці груп. З мэтай павышэння якасці вучэбнага працэсу заняткі па ўсіх дысцыплінах праводзяцца як у групах поўнай камплектнасці (20–22 слухача), так і ў групах малой камплектнасці (5–10 слухачоў), дзе форма заняткаў прымае індывідуальны характар.

Тэл. для даведак: 200-47-63.

З мэтай эфектыўнай падрыхтоўкі абітурыентаў да ЦТ з 2004 г. сумесна з РІКВ праводзіцца **рэпетыцыйнае тэсціраванне**. Пасля камп'ютарнай апрацоўкі вынікаў тэсціравання з абітурыентамі для ахвотных праводзіцца кансультацыі з поўным разборам тэставых заданняў.

Тэл.: 209-54-06.

ФДА вядзе прыём вучняў 9–11 класаў у «Школу юнага эканаміста», «Школу юнага дызайнера», "Школу юнага ІТ-спецыяліста».

Заняткі ў *«Школе юнага эканаміста»* арганізаваны сумесна з эканамічным факультэтам. Прадугледжаны практыкумы, дзелавыя і ролевыя эканамічныя гульні, псіхалагічныя трэнінгі, якія дазваляюць слухачам атрымаць веды па эканамічных дысцыплінах, навучыцца асновам прадпрымальніцкай дзейнасці.

*«Школа юнага дызайнера»* – гэта практычныя курсы для тых, хто жадае спазнаць асновы дызайну, пашырыць кругагляд і звязаць жыццё з дадзенай прафесіяй. Вучэбны працэс арганізаваны сумесна з кафедрай дызайну гуманітарнага факультэта. На занятках створаны ўсе ўмовы для фарміравання крэатыўных мастацкіх здольнасцяў, а таксама для развіцця праектна-творчага мыслення і мастацка-вобразнага майстэрства будучых дызайнераў.

Навучанне ў *«Школе юнага ІТ-спецыяліста»* дае магчымасць зарыентавацца ў плыні сучаснай адукацыі па ІТ-кірунках, вызначыцца з такімі спецыяльнасцямі, як "Прыкладная матэматыка (вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн)», «Матэматыка (вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі)». Навучанне камп'ютарнай графіцы, вэб-дызайну, аўдыя- і відэамантажу вядзецца праз практыкумы на сучаснай камп'ютарнай тэхніцы. Заняткі праводзяць спецыялісты вучэбнага цэнтра вочна-завочнага і дыстанцыйнага навучання.

Вучэбныя планы школ даюць таксама магчымасць для навучэнцаў 10–11 класаў прайсці падрыхтоўку да ЦТ па профільных прадметах і да здачы іспыту «Творчасць» спецыяльнасці «Дызайн». Прадугледжана прафарыентацыйная дыягностыка і прафкансультаванне навучэнцаў.

Навучанне ў школах платнае.

Тэл.: 334-80-04, 331-79-63, 209-54-06.

***Алег Аляксеенкаў,*** *старшыня савета маладых вучоных БДУ. Выпускнік 2004 г.*

*Навучанне на ФДА – гэта трывалы мосцік паміж школай і гістарычным факультэтам БДУ. Я атрымаў глыбокія веды, змог самарэалізавацца, сустрэў сапраўдных сяброў, з якімі крочу па жыцці.*

***Ганна Сакалоўская,*** *выкладчык англійскай мовы БДЭУ, старшыня савета старастаў факультэта. Выпускніца 2004 г.*

*На ФДА мы навучыліся вучыцца, зразумелі ролю самаадукацыі, выпрацавалі сістэму, набылі шмат верных сяброў. Калі вас спасцігла няўдача на ўступных экзаменах, ідзіце на ФДА, не пашкадуеце!*

# ЛІЦЭЙ БДУ

***Дырэктар – кандыдат хімічных навук дацэнт Вадзім Эдвардавіч МАТУЛІС***
***Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8.***
***Тэл. 226-01-12, 209-52-65***
***Website: www.lyceum.by, e-mail: info@lyceum.by***

Ліцэй БДУ быў адкрыты дзеля пошуку, адбору і навучання таленавітых старшакласнікаў з усёй Беларусі.

У бягучым навучальным годзе прыём у ліцэй будзе ажыццяўляцца ў 10-я класы з тэрмінам навучання 2 гады.

Для вучняў 10-х класаў мы прапануем 4 напрамкі навучання: **фізіка-матэматычны**, **хіміка-біялагічны**, **філалагічны**, **грамадазнаўчы**. Уступныя іспыты праводзяцца пісьмова па двух прадметах, якія адпавядаюць абранаму кірунку адукацыі.

Без уступных іспытаў у ліцэй залічваюцца пераможцы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды.

Усім навучэнцам ліцэя прапануецца вялікі шэраг факультатыўных заняткаў.

Па заканчэнні ліцэя выпускнікі атрымліваюць атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі.

За апошнія гады Ліцэй БДУ стаў адной з самых прэстыжных навучальных устаноў нашай краіны. У 2010 г. сярэдні конкурс склаў 6,5 чалавек на месца.

У ліцэі працуюць *платныя вячэрнія курсы для навучэнцаў 8–11 класаў*, якія плануюць у далейшым паступаць у ліцэй і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Гэтая задача паспяхова рэалізуецца – больш за палову з тых, хто паступіў у ліцэй, складаюць слухачы згаданых курсаў.

Вучэбна-выхаваўчы працэс у ліцэі ажыццяўляюць кваліфікаваныя работнікі адукацыі і навукі.

Дзейнічае 10 кафедраў: матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і геаграфіі, беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, замежных моў, грамадскіх навук, інфарматыкі і фізічнай культуры.

Навучальны працэс у Ліцэі БДУ арганізаваны ў форме спараных урокаў. Гэта дазваляе ладзіць заняткі ў форме лекцый, семінараў, лабараторных работ.

У Ліцэі БДУ пяцідзённы навучальны тыдзень. Шосты дзень – субота – прызначаны для факультатыўных заняткаў, спартыўных і пазакласных мерапрыемстваў.

Мы маем вельмі значныя дасягненні: за 20 год існавання ліцэя нашы навучэнцы заваявалі 1071 дыплом Рэспубліканскай алімпіяды, 65 з іх – у 2010 г.

Асабліва ўражваюць поспехі ліцэістаў на міжнародных алімпіядах – 141 медаль, сярод якіх 15 залатых. Такім чынам робіцца важкі ўнёсак ва ўмацаванне прэстыжу нашай краіны за мяжой.

Акрамя алімпіяд, шмат увагі надаецца і іншым формам пазакласнай работы па прадметах. Гэта навуковыя канферэнцыі навучэнцаў і інтэлектуальныя турніры. Больш за 150 ліцэістаў сталі прызёрамі гэтых спаборніцтваў.



Пачынаецца ўсё з навуковай канферэнцыі «Першы крок у навуку», якая ладзіцца штогод напярэдадні святкавання Дня нараджэння ліцэя.

У ліцэі наладжана вельмі эфектыўная сістэма ідэйна-выхаваўчай работы. Яна ўключае цікавыя мерапрыемствы, якія з'яўляюцца вынікам дзейнасці вакальнай, танцавальнай, драматычнай студый, спартыўных секцый, тэатра педагогаў.

За час існавання Ліцэя БДУ яго закончылі больш за 4 тыс. навучэнцаў, больш за 600 з іх з залатымі і сярэбранымі медалямі. Практычна ўсе выпускнікі адразу працягнулі вучобу ў ВНУ Беларусі і за мяжой. Узровень і якасць атрыманых ведаў і навыкаў дазваляе ім вытрымаць самыя вялікія конкурсы.

Сярод ліцэістаў больш за 600 чалавек сталі стыпендыятамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

У апошнія гады кантроль ведаў выпускнікоў праводзіцца ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Вынікі ліцэістаў прыкладна на 40–50 балаў перавышаюць сярэдні бал па краіне.

Гэтыя вынікі з'яўляюцца плёнам мэтанакіраванай і самааддана́й працы педагагічнага калектыву. Нашы настаўнікі, акрамя навучальнай работы, актыўна прапагандуюць свой педагагічны досвед, яны апублікавалі больш за 400 артыкулаў у навукова-метадычных часопісах, а таксама выдалі шмат падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Нашы намаганні атрымалі высокую ацэнку кіраўніцтва краіны. У 2004 г. Ліцэю БДУ была прысуджана прэмія ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, а ў 2007 г. званне лаўрэата было пацверджана.

# ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ

***Дырэктар – кандыдат юрыдычных навук дацэнт Ігар Раманавіч ВЯРЭНЧЫКАЎ***
***Адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, 21. Тэл./факс 289-12-82.***
***E-mail: college@bsu.by; www.lawcollege.bsu.by***

РАЗВІЦЦЁ

Юрыдычны каледж БДУ быў адкрыты 1 верасня 2000 г., а ў 2003 г. загадам міністра адукацыі ён быў вызначаны ў якасці базавай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы па праблемах прававой адукацыі.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі ў Юрыдычным каледжы пацвярджаецца тым, што ў цяперашні час больш за 90 % нашых былых навучэнцаў працягваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ, з іх 40% – на дзённых аддзяленнях.

Дзякуючы якаснаму прафесарска-выкладчыцкаму складу (24 чалавекі маюць навуковыя званні і ступені), за 10 гадоў дзейнасці каледж стаў адной з найбольш прэстыжных ССНУ краіны.

Спецыяльнасці і спецыялізацыі

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па спецыяльнасці **«Правазнаўства»** з наступнымі спецыялізацыямі: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа». Выпускнікам надаецца кваліфікацыя «*Юрыст*».

НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Навучанне ў каледжы ажыццяўляецца па вучэбных планах і праграмах, якія даюць паглыбленую гуманітарную і спецыяльную падрыхтоўку, а таксама адпаведныя практычныя навыкі.

Навучальны працэс забяспечваюць чатыры кафедры: дзяржаўна-прававых і крымінальна-прававых дысцыплін, агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін. Дзейнічаюць тры аддзяленні: на аснове агульнай базавай адукацыі і агульнай сярэдняй адукацыі, завочнае аддзяленне.

У каледжы функцыянуюць тры камп'ютарныя класы, а таксама лабараторыя заканадаўства, бібліятэка і чытальная зала з вялікім выбарам найноўшай юрыдычнай літаратуры. Каледж падключаны да агульнаўніверсітэцкай інфармацыйнай сеткі, мае свабодны выхад у інтэрнэт.

Іншагароднія навучэнцы аддзялення на аснове агульнай базавай адукацыі забяспечваюцца інтэрнатам.

Асноўнымі базамі тэхналагічнай і пераддыпломнай практык з'яўляюцца Міністэрства юстыцыі Беларусі, сістэма агульных судоў, гаспадарчы суд Мінска, раённыя адміністрацыі Мінска і выканкамы раёнаў, суб'екты гаспадарання розных формаў уласнасці.

Выпускнікі каледжа маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ са скарочаным тэрмінам навучання (пачынаючы з III курса).

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

Выпускнікі Юрыдычнага каледжа могуць працаваць:

– у юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах органаў выканаўчай улады (міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнага кіравання) і органаў мясцовага кіравання і самакіравання (сацыяльнай абароны, ліцэнзавання і рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, землеўпарадкавання, статыстыкі і інш.);

– юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, некамерцыйных юрыдычных асоб (грамадскія арганізацыі, прафесійныя саюзы і г. д.);

– органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, выкананне судовых пастаноў, забеспячэнне судовай вытворчасці і г. д.);

– органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і г. д.);

– установах юстыцыі (органы ЗАГСа, натарыяту, адвакатуры, архівы юрыдычных кансультацый).

ПАЗАВУЧЭБНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Нашы выхаванцы прымаюць актыўны ўдзел у спартыўным і культурным жыцці каледжа і ўніверсітэта (гуртках, студыях, клубах і г. д.). Добрай традыцыяй стала правядзенне «Пасвячэння ў навучэнцы каледжа», «Беларускага тыдня», конкурсу «Лэдзі каледж», «Найлепшая група Юрыдычнага каледжа», турніраў «Што? Дзе? Калі?», конкурсу аратарскага майстэрства «Залатавуст», «Дзён каледжа» і многіх іншых мерапрыемстваў.



Наш каледж – навучальная ўстанова для здольных і энергічных юнакоў і дзяўчат. Ён рыхтуе кваліфікаваных юрыстаў, якія спалучаюць глыбокія тэарэтычныя веды з уменнем іх практычнага ўвасаблення. Гэта дазваляе ім знайсці перспектыўную, цікавую, высокааплатную працу, якая будзе для іх справай усяго жыцця.

**ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРЫЁМЕ Ў ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ У 2011 г.**

Прыём ажыццяўляецца на дзённую і завочную формы навучання.

ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай базавай адукацыі (9 кл.): «Правазнаўства». Тэрмін навучання – 3 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова – дыктоўка, матэматыка – пісьмовая работа.

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): «Правазнаўства». Тэрмін навучання – 2 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова – ЦТ, матэматыка – ЦТ.

Падрыхтоўчыя курсы. Для тых, хто паступае на аснове агульнай базавай адукацыі: гадавыя – кастрычнік-май, кароткатэрміновыя – чэрвень-ліпень, а таксама на працягу года па меры набору груп. Тэл. 289-12-82.

Інтэрнат падчас уступных іспытаў даецца ўсім абітурыентам, падчас навучання – толькі навучэнцам на аснове агульнай базавай адукацыі.

ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): «Правазнаўства» (спецыялізацыі: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа»). Тэрмін навучання – 3 гады 10 месяцаў. Уступныя іспыты: беларуская (руская) мова – ЦТ, матэматыка – ЦТ.

На завочную бюджэтную форму могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і працуюць па спецыяльнасці, а таксама дзеці-інваліды, інваліды I, II групы.

Паколькі каледж з'яўляецца структурным падраздзяленнем Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, то ўступныя выпрабаванні праводзяцца прыёмнай камісіяй БДУ. Парадак прыёму ў каледж рэгулюецца Правіламі прыёму ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 № 80 (з апошнімі зменамі, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.04.2010 № 200).

УНІВЕРСІТЭТ
**Выдаецца з 1929 года**

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

27 снежня 2010 года
Падпісана да друку 23.12.2010 г.
Зак. . Тыраж 2500 экз.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***